Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 12 (2810) Год LV | Беласток, 21 сакавіка 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Ілона КАРПЮК

У 2002 годзе падчас перапісу насельніцтва ў межах гарадской гміны Сямятычы 236 асоб назвала сябе беларусамі. Пачынаю з гэтай інфармацыі, паколькі, між іншым, з гэтага горада пачнецца пробны перапіс насельніцтва, які мае праверыць цэлы механізм перад асноўным перапісам, які адбудзецца паміж 1 красавіка а 30 чэрвеня 2011 года. Закон аб перапісе Сейм Рэчы Паспалітай прыняў 4 сакавіка г.г., зараз ён будзе разглядацца Сенатам.

2011 перапіс насельніцтва Напярэдадні перапісу

Паводле закону, **нацыянальнасць** (прыналежнасць нацыянальная або этнічная) — гэта дэкларатыўная, падтрымліваная суб'ектыўным пачуццём, індывідуальная рыса кожнага чалавека, якая з'яўляецца выразам эмацыянальнай, культурнай або звязанай з паходжаннем бацькоў, акрэсленым народам ці этнічнай супольнасцю сувязі.

Так акрэсліваецца сфера нашага жыцця, якая ў 2011 г. стане адной з тэм перапісу насельніцтва. Сярод пытанняў, звязаных з нацыянальнасцю ды пачуццём культурнай адметнасці, паявяцца пытанні пра мову, якой карыстаемся ў хаце, а таксама новыя паказчыкі адметнасці жыхароў Польшчы. Паяўляецца новая катэгорыя апісання нашага самаадчування, менавіта „родная мова". Закон не высвятляе, што падразумяваецца пад гэтым тэрмінам і перш за ўсё будзе ізноў лічыцца наша суб'ектыўнае адчуванне.

Упершыню пасля вайны ў перапісе запытаюць нас пра веравызнанне. Гэтае пытанне аднак прыналежыць да групы трох (яшчэ колькасць жывых народжаных дзяцей і пракрэацыйныя планы ды знаходжання ў нефармальнай сувязі з партнёрам), на якія адказваем добраахвотна.

Перапіс 2011 г. упісваецца ў рамкі шырокай акцыі ва ўсім Еўрасаюзе. Мае тым большае значэнне, што за апошнія гады да Еўрасаюза далучыліся чарговыя краіны. Дванаццаць новых сябраў ЕС мяняе культурны і дэмаграфічны краявід гэтай супольнасці, таму перапіс з'яўляецца неабходнасцю па статыстычных і навуковых прычынах.

Пробны перапіс насельніцтва ў Польшчы пройдзе з 31 красавіка па 31 траўня 2010 года. Яго мэта ў асноўным — праверыць тэхналогіі правядзення перапісу. У час пробаў будзе правярацца падрыхтоўка перапісчыкаў ды магчымасці сістэм перапісу. Да пробнага перапісу адабраны шаснаццаць мясцовасцей, якія прадстаўляюць кожнае ваяводства. Дзве мясцовасці, менавіта ў Падляшскім ды Апольскім ваяводствах, у ліку сваіх жыхароў маюць прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, таму Галоўная статыстычная ўстанова разглядала мачгымасць удзельніцтва ў падрыхтоўцы перапісчыкаў з ліку прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, што было, між іншым, адной з тэм, якой цікавілася Супольная камісія ўрада і меншасцей. У асноўным магчымасць такая будзе мець значэнне перад галоўным перапісам у 2011 г., напэўна гэтая ідэя вартая зацікаўлення. Па-першае, таму, што якраз праца перапісчыкаў у сем'ях іншай чым польская нацыянальнасць сустракалася з найбольшай крытыкай пасля папярэдняга перапісу ў 2002 годзе. У шматлікіх сітуацыях адсутнічалі не толькі веды наконт іншых нацыянальнасцей, але таксама ўражлівасць ды зразуменне сітуацыі з боку перапісчыкаў.

Дзякуючы развіццю інтэрнэту за апошнія гады таксама пры нагодзе перапісу будзе магчымасць ім скарыстацца. Можа гэта палегчыць перапіс у асноўным тым,

працяг ☞ 4

Лістоўка, якая распаўсюджвалася перад перапісам насельніцтва ў 2002 годзе

Запрашэнне

25.03.1918 **БНР** 25.03.2010

Святкаванні 92-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі

адбудуцца 25 сакавіка (чацвер) у Беластоку ў цэнтры Ваяводскага асяродка анімацыі культуры „Сподкі" па вул. Святога Роха, 14 у Беластоку а гадз. 18.00 (уваход свабодны)

Запрашаюць: Телеканал Белсат, Радыё Рацыя,„Ніва", Беларускі саюз

у праграме м.інш.

Прэзентацыя 60-хвіліннага дакументальнага фільма телеканала Белсат пра генерала Станіслава Булак-Балаховіча з уводным словам прафесара Алега Латышонка.

Кафедра беларускай культуры
Філалагічны факультэт
Універсітэта ў Беластоку

запрашае на

Беларускія чацвяргі інтэрдысцыплінарны канверсаторый

18 сакавіка 2010
Ганна Кандрацюк-Свярубская
„Адкрыванні кампазітара Яна Тарасевіча"
17.00, вул. Лінярскага 3, зала 1Б

9 770546 196000

Эпоха нелюбові

У апошнія некалькі дзён мне настойліва тэлефануюць сябры, знаёмыя і пытаюцца, ці можа я ведаю што-небудзь пра тое, што здарылася з Уладзімірам Саўчанкам, нядаўнім старшынём Гродзенскага аблвыканкама. Падзенне заўсёды падзея. Па ўсёй вобласці цыркулююць чуткі адна сенсацыйней другой. Ні то былы кіраўнік гродзенскай „вертыкалі" застрэліўся, ні то павесіўся ў лякарні, ні то быў забіты пры невядомых акалічнасцях. Што адбываецца ў беларускіх уладных колах — таямніца за сямю пячаткамі. Аніякай інфармацыі ў дзяржаўных медыях няма. Гэта вынік той палітыкі абсалютнага браку галоснасці і поўнай скрытасці ўсіх уладных працэсаў, якая ўкараняецца апошнія 15 гадоў у Беларусі. Афіцыйна вядома толькі тое, што таксама ўжо былы начальнік гродзенскай міліцыі генерал-маёр Генадзь Хацько знаходзіцца ў крымінальным вышуку. На яго генеральнай пракуратурай распачата справа па артыкуле „перавышэнне ўлады альбо службовых паўнамоцтваў". Паралельна ў Мінску ідзе судовы працэс над ваўкавыскім прадпрымальнікам Мікалаем Аўтуховічам і групай іншых асоб, якіх вінавацяць нібыта ў падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта якраз у дачыненні да былога старшыні аблвыканкама.

Лёс апошніх гродзенскіх „губернатораў" вельмі незайздросны. Дзмітрыя Арцыменю застрэлілі ля брамы ўласнага дома. Забойцаў да гэтага часу так і не знайшлі. Аляксандр Дубко памёр пры загадкавых і цьмяных абставінах. Што сталася з Уладзімірам Саўчанкам, нам невядома. Магчыма, што нічога асаблівага. Па вялікім рахунку гэта і не павінна цікавіць. Гісторыя рана ці позна дае належную ацэнку ўсім. Зразумела пакуль толькі адно — тое, што найбольш адыёзны кіраўнік Гродзенскай вобласці за пасляваенны час больш ёю не кіруе. Цягам кіравання Саўчанкі хадзілі легенды пра тое, як ён выстройвае падначаленых у шэраг і крычыць на іх страшным матам, як ён прыніжае іншых і не лічыцца з людзьмі. Ніжэйшыя па рангу спраўна пераймалі і капіявалі стыль свайго шэфа. Такога татальнага хамства чыноўнікаў не было і блізка нават за савецкім часам. А дзяржаўныя ідэолагі-журналісты ўсе гэтыя берасневыласмінскія пастаральнымі фарбамі твораць ружовыя карцінкі партрэтаў ідэальных „айцоў народа". І вось месяц таму „ўсемагутны" ваявода паводле афіцыйнай версіі напісаў заяву з просьбай вызваліць яго з пасады па ўласным жаданні ў сувязі з праблемамі ў здароўі. А надзвычайны ажыятаж вакол асобы Уладзіміра Саўчанкі, які паводле яшчэ адной ні то легенды, ні то праўды, з'яўляецца кумам самога Вярхоўнакамандуючага, тлумачыцца падсвядомай прагай справядлівасці, гэткай маральнай кампенсацыі. Хоць насамрэч ёсць праявай „эпохи большой нелюбви", як сказана Андрэем Макарэвічам.

Праблема ж „чорнай масці" нікуды не падзелася. Прычына ж не ў Хацьку, Саўчанку, ці нават Лукашэнку. Пераканаўся я ў гэтым яшчэ раз днямі, калі разам з калегам зайшлі ў Гродзенскі аблвыканкам. Прадстаўнік тэрытарыяльнай выбарчай камісіі, якога мы патурбавалі крыху памылкова (але ж не на яго асабістым лецішчы, а на дзяржаўнай службе!), за нейкіх дваццаць секунд размовы выплюхнуў на нас столькі фанабэрыі і пагарды, што непрыемнае пачуццё не пакідала нас цэлы дзень. Дзіўная гэта рэч — чалавечая псіхалогія. Няўжо гэтыя „вяршыцелі лёсаў" думаюць, што яны сапраўды такія магутныя і вечныя на гэтых чыноўніцкіх пасадах? Няўжо яны не разумеюць, што гідра таталітарнай машыны жарэ і паглынае найперш іх? Няўжо яны не ўсведамляюць, што грэх гордасці нішчыць іх душы.

Ізноў тут дазволю працытаваць таго ж Макарэвіча: „Мне не страшна, што кожны трэці можа мяне забіць, страшна тое, што я больш не чую да іх любві". Не раз даводзілася ўжо пісаць пра тое, што ў нашай дзяржаве пануе зараз грамадзянская нянавісць. Самае галоўнае для беларускай супольнасці сёння — гэта не памнажаць яе, не прымаць чужынскага і шанаваць свае нацыянальныя вартасці. Прытым палітычная апазіцыя ўжо зараз мусіць рыхтаваць праект закону аб люстрацыі. Але толькі без нянавісці і жадання помсты...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Гады адыходзяць, праблемы застаюцца

Пра тое, што хачу коратка тут прадставіць, я даўно думаў, але ніколі не задзейнічаў. Не задзейнічаў таму, што па сваім сціплым характары не хацеў у чыіхсьці вачах быць „кімсьці", хто суне нос не ў свае справы. Я, як чалавек дысцыплінаваны і ўражлівы на пункце вайсковай справы, вельмі дбаў аб гонар салдата, а асабліва тады, калі жаўнерскія масы невіноўна пакутавалі ад знявагі і гінулі як смецце. Мне салдаты Чырвонай Арміі і Народнага Войска Польскага былі заўсёды вельмі дарагімі, і тыя, што ваявалі, і выжылі пасля вайны, а таксама і помнікі, якія ім паставілі. І калі я ў сямідесятыя гады мінулага стагоддзя быў намеснікам гуртка (800 асоб) Саюза барацьбітоў за свабоду і дэмакратыю, аднойчы ў свабоднай гутарцы падаў прапанову, каб маршалу Савецкага Саюза, двойчы герою СССР Васілю Сакалоўскаму паставіць помнік. Ніхто з прыступных не адазваўся. А я дадаў: „Гэта ж наш зямляк з вёскі Козлікі каля Заблудава". Я зразумеў, што мае прыхільнікі ведаюць гэтае асяроддзе лепш чым я, новаабраны, і не хацелі дражніць калег з іншых груповак, дык прамаўчаў.

Пасля, з нагоды 30-й гадавіны Вялікай перамогі на маю просьбу польская рэдакцыя Маскоўскага Радыё перадала: *W związku z trzydziestą rocznicą zwycięstwa Polska Redakcja Radia Moskiewskiego przesyła pozdrowienia członkom ZBOWiD Koła nr 3 i piosenkę Bułata Okudżawy „Бери шинель, иди домой"*. Я ўсцешаны пайшоў на пасяджэнне праўлення гуртка і запрапанаваў, каб паслухалі таго, што я прынёс. Уключыў магнітафон і пусціў тое, што нам перадалі. Паслухалі, каб мне зрабіць прыемнасць — думаю, але ніхто словам не азваўся, ці добра я зрабіў, напісаўшы ў Маскву, ці мо што песня прыгожая. Маўчалі. А пасля пасяджэння падышла да мяне на вуліцы сяброўка з праўлення і сказала: *Bardzo panu dziękuję za piosenkę, ale czy widział pan reakcję panów z AK? Oni by pana utopili w łyżce wody!*

Я канчаткова перастаў быць аптымістам і нават не пайшоў да палкоўніка Яна Анаціка з прапановай вярнуцца да справы помніка Васілю Сакалоўскаму, бо падумаў, што ён ведае, і больш за мяне можа. І так засталося.

Сёння, калі абрываецца нітачка са сплеценай вяроўкі майго існавання, я ўжо новых кніжак не купляю, а толькі чытаю і прачытваю тыя, якія маю. І вось ноччу з 6 на 7 студзеня 2010 года заглянуў я зноў у кніжку Канстанціна Сіманава ў перакладзе на польскую мову *„Każdy dzień jest długi"*. І зноў перачытваю: *„Tempelhof. Ranek. Nikt jeszcze nie przyleciał, lotnisko puste. Tylko na środku lotniska mały, gruby pułkownik odbywa z kompanią honorową ćwiczenia długo przed spotkaniem z sojusznikami, raz za razem — podczas wojny odzwyczailiśmy się od takich rzeczy. Leżymy na trawie i nudzimy się. Wreszczcie przyjeżdża marszałek Sokołowski, zastępca dowódcy Pierwszego Frontu Białoruskiego z kilkoma generałami..."*

Вось, вось, менавіта: маршал, выдатны палкаводзец, двойчы герой Вялікай перамогі, які ніколі не быў ніякім і нічыім катам. А за гэта, што нарадзіўся ў беларускай вёсцы на Беласточчыне і быў палкаводцам арміі непадданай Пілсудскаму, — не мае следу памяці нават у сваёй роднай вёсцы, бо і за гэта лізуны іншых, якія вызваленне Польшчы і Беласточчыны называюць акупацыяй, а вызваліцеляў — бандытамі, не захацелі ўшанаваць яго памяці.

А кніжкі нават начамі чытаю і перачытваю, каб мець крыху паняцця і ведаць як павесці сябе ў пекле, бо толькі там маё месца, у прысутнасці тых, хто на Зямлі называў мяне з аднаго боку сталіністам, а з другога — пілсудчыкам. Хто прызнаў мяне беларусам, які біўся як рыба аб лёд, каб стаць чалавекам ім роўным, а то і вышэйшым у культуры і ведах наогул?

Не хачу ў тым месцы развіваць тэмы, але як жа прыкра цярпець, калі ў мешаным сужонстве назавуць цябе „кацапам", або калі ў гасціне адна полька сярод беларусаў спытаецца: *Wujku, po jakiemu ty bełkoczesz?* Беларусы паклалі вушы па сабе і ніхто не адазваўся ў абарону чалавека, які загаварыў не так як яны — па-польску. Мала таго: ёсць такія беларусы, якія ганарацца тым, што не ведаюць беларускай мовы! І што, будзем так вянуць, аж высахнем?!.

Васіль ПЕТРУЧУК

Вачыма еўрапейца

Замяшанне з Кузніцай

— Праз найважнейшы польска-беларускі пагранпераход у Кузніцы-Беластоцкай пасля ўступлення ў сілу дамовы аб малым памежным руху (МПР) нельга будзе прайсці пешшу аб пераехаць на веласіпедзе, — турбаваўся ў апошні час у перадачы беластоцкага асяродка TVP генеральны консул РБ у Беластоку Міхал Аляксейчык. Гэтае выказванне выклікала амаль буру. Прэс-сакратар падляшскага ваяводы (адказвае ён за стан перганпераходаў у рэгіёне) адрэагавала адразу. Яшчэ ў гэтым самым матэрыяле ў тэлебачанні яна рашуча гарантавала, што якраз у Кузніцы ёсць ужо для гэтай мэты здаўна падрыхтаваная інфраструктура. Удалося мне асабіста папрасіць ваяводу Мацея Жыўну пракаментаваць выказванне генконсула Аляксейчыка:

— Я фармальна выступіў да пана консула аднесціся да гэтых выказванняў у СМІ, паколькі мы афіцыйнага запыту не атрымалі. Як ваявода адказваю за пагранпераходы з польскага боку і запэўніваю, што ўжо гатовы асобныя палосы для пешага перасякання мяжы, якія пасля ўступлення ў сілу дамовы аб МПР будуць пушчаны ў рух. Выказванне генконсула на гэтую тэму зусім для мяне незразумелае. Можа гаварыў ён пра стан пагранпераходу з беларускага боку. У лісце пры нагодзе пастаўлю яму таксама гэтае пытанне.

Прэс-сакратар Падляшскай часці Памежнай аховы маёр Анна Вуйцік таксама не скрывала здзіўлення:

— На ўсіх нашых пагранпераходах будуць выдзелены спецыяльныя палосы.

Рашыў я тады спытацца ў спадара генконсула, адкуль у яго інфармацыя аб тым, быццам бы не будзе магчымым у Кузніцы перабрацца праз мяжу пешшу ці на роверы. Калі мы размаўлялі, ліст ад ваяводы яшчэ да яго не трапіў:

— Па-першае, я пераканаўся ў гэтым на ўласныя вочы. Па-другое, у дамове нічога не гаворыцца пра перасякання мяжы пешшу ці на веласіпедзе.

Дадаў таксама, што, як сказаў, сумняваецца ў тым, ці такім чынам з беларускага боку будзе можна перасякаць мяжу пасля ўступлення ў сілу дамовы аб МПР.

— У нас для пешага і веласіпеднага руху пагранрепаход прыстасаваны толькі ў Белавежы.

На яго думку, праблема на пагранпераходзе Кузніца—Брузгі, але і на пагранпераходзе Баброўнікі—Бераставіца, заключаецца перш за ўсё ў г.зв. „вузкім горле" непасрэдна ў памежным пункце, а не на даязным адрэзку:

— На пагранпераходзе Баброўнікі—Бераставіца трэба было б збудаваць новы мост, праз які маглі б пераходзіць людзі. Інакш гэты пагранпераход будзе небяспечны для іх.

Пры нагодзе генконсул скардзіўся на застой у працах на польскім баку на пагранпераходзе Рудаўка—Лясная на Аўгустоўскім канале:

— Гэты пагранпераход яшчэ негатовы для суднаходства малых пасажырскіх караблёў. З беларускага боку пагранпераход для тагога руху поўнасцю падрыхтаваны.

Наконт пагранпераходу ў Кузніцы генконсул на ўсякі выпадак скансультаваўся з адной з працаўніц свайго беластоцкага дыпрадстаўніцтва. Гэтая таксама заявіла, што не бачыла, каб на польскім баку была выдзелена асобная паласа для пешага ці веласіпеднага перасякання мяжы.

— Калі дамова будзе ратыфікавацца з беларускага боку, тады можна будзе згодна з законам штосьці зрабіць у гэтай справе, — дадаў генконсул.

З інфармацыі, якую перадаў генконсул Аляксейчык, вынікае, што беларускі бок мае ратыфікаваць дамову на пасяджэнні парламента на пачатку красавіка, некалькі тыдняў пасля мае падпісаць яе прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Партнёры? Назіральнікі?

Крыху закіпела, калі выступіў Ян Мордань. Перадаў ён дырэктару Ружанскаму петыцыю сялян вёскі Райск, якую накіравалі яны ў канцы мінулага года ўраду і якая дагэтуль засталася без адказу. Змешчана ў ёй просьба вырашыць справу перадачы Агенцтвам сельскіх нерухомасцей (АСН) у 2006 г. сельскіх грунтаў Дзяржаўнай казны плошчай у 115 гектараў распаложаных на тэрыторыі гэтай вёскі праваслаўнай Люблінска-Холмскай епархіі.

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

У гэты раз у Дзень жанчын падляшскі ваявода Мацей Жыўна сарганізаваў штогадовую сустрэчу з прадстаўнікамі арганізацый нацыянальных і этнічных меншасцей рэгіёна. Працягвалася яна няпоўныя паўтары гадзіны, бо — як бывала дагэтуль — лавіны пытанняў і спраў, выенесеных для абмеркавання запрошанымі, не было. Найважнейшая ў дыскусійнай частцы была праблема перадачы Люблінска-Холмскай епархіі зямлі ў вёсцы Райск (Бельская гміна), якую вынес Ян Мордань, старшыня Таварыства „Гай".

Сустрэча, якую вёў упаўнаважаны ваяводы па справах меншасцей Мацей Тэфэльскі, пачалася з інфармацыі аб перадачы ваяводам прэзідэнту Беластока будынка па вуліцы Святога Роха, 3 (былая скурная лячэбніца), у якім будуць мець сваю сядзібу беластоцкія няўрадавыя арганізацыі, мабыць і меншасныя.

— Незалежна ад крызісу аказалася, што можна няўрадавым арганізацыям перадаць такі самавіты аб'ект [1 600 кв. метраў — М. Х.], — сказаў ваявода Жыўна.

Аднак Анна Паўлоўская, упаўнаважаная прэзідэнта Беластока па справах няўрадавых арганізацый, адзначыла: „Гэты будынак патрабуе рамонту, значыць, трэба часу і сродкаў, каб здаць яго ў карыстанне. Гэта зойме найменш два гады".

На чатырох паверхах па вул Св. Роха, 3, размесціцца перш за ўсё абучальныя і канферэнцыйныя залы ды офісныя памяшканні. Можна тут будзе весці дзейнасць таксама пасля поўдня і вечарамі ды ў выхадныя дні. З ліку 747 зарэгістраваных у Беластоку рознага роду няўрадавых арганізацый, 38 ужо заявіла патрэбу мець сваю сядзібу ў выключным валоданні. Малыя, аднак, шанцы на тое, каб мелі яны на гэтых прынцыпах памяшканні якраз у гэтым будынку.

— Гэты цэнтр не палагодзіць усіх праблем няўрадавых арганізацый у горадзе, — быў упэўнены ваявода.

Катажына Латоўская з Асяродка падтрымкі няўрадавых арганізацый тлумачыла як дайсці да інфармацыі, звязанай з магчымасцю здабыць еўрасаюзныя сродкі. Юзаф Ружанскі, дырэктар дэпартамента канфесій ды нацыянальных і этнічных меншасцей МУСіА ў сваю чаргу прадбачыў, што ў маі ў Любліне будзе ўрачыста адзначацца пятая гадавіна ўваходу ў сілу закону аб меншасцях:

— Прашу падказаць, што трэба было б змяніць. Прымерваемся таксама да навелізацыі адпаведных ведамственных юрыдычных актаў. Хочам прыцягнуць да размеркавання фінансавых сродкаў меншасныя арганізацыі.

Тут дырэктар Ружанскі адзначыў, што гаворка аб тым, каб у гэтай справе меншасці дэлегавалі „даверaныя асобы" не са сваіх арганізацый: „Немагчыма быць суддзёй у сваёй справе. Гэта павінны быць незалежныя эксперты па нацыянальных меншасцях, — тлумачыў пасля сустрэчы журналістам, а яшчэ ў час яе ганарыўся: — Сёлетні бюджэт пасля ўмяшання паноў Тамаша Сямоняка [дзяржсакратар у МУСІА — М. Х.] і Гжэгажа Схетыны [былы міністр унутраных спраў — М. Х.] застаўся на ўзроўні 2009 года".

Значыць, на каля 300 праектаў меншасных арганізацый МУСіА сёлета прызначыла больш за 12,8 мільёна злотых.

Дадаў:

— Хочам быць вашым партнёрам, а не наглядчыкам.

Пасля:

— Маем намер выступіць з лістом і запытацца ці меншасныя арганізацыі намерваюцца штосьці зрабіць у інвестыцыйных пытаннях.

Крыху закіпела, калі выступіў Ян Мордань. Перадаў ён дырэктару Ружанскаму петыцыю сялян вёскі Райск, якую накіравалі яны ў канцы мінулага года ўраду і якая дагэтуль засталася без адказу. Змешчана ў ёй просьба вырашыць справу перадачы Агенцтвам сельскіх нерухомасцей (АСН) у 2006 г. сельскіх грунтаў Дзяржаўнай казны плошчай у 115 гектараў распаложаных на тэрыторыі гэтай вёскі праваслаўнай Люблінска-Холмскай епархіі. „У выніку нашых хадатайстваў у 2006 г. мы арандавалі большасць гэтых грунтаў і аб іх перадачы даведаліся пасля факту без магчымасці апеляцыі, — напісана ў петыцыі. — Нас пазбавілі магчымасці павелічэння абшару нашых гаспадарак і гэтым самым магчымасці іх развіцця". Падпісанты-сяляне патрабуюць вяртання гэтых 115 гектараў, а землі падобнага абшару надзяліць епархіі ў Любліне з грунтаў распаложаных на Люблiншчыне. На канец напісана: „Адмена гэтага рашэння дасць магчымасць павелічэння сямейных сельскіх гаспадарак у вёсцы Райск, а тым самым іх развіцця і адначасова рацыянальнага добраўпарадкавання грунтаў Дзяржаўнай казны на тэрыторыі Люблінскага ваяводства, дзе застаецца да размеркавання некалькі тысяч гектараў распаложаных у розных гмінах". Солтыс Райска Ірэна Цішук у час сустрэчы ў ваяводы тлумачыла:

— Наша вёска абязлюджваецца. Сяляне, якія засталіся, хочуць павялічыць гаспадаркі, а АСН перадае немясцовым нашыя 115 гектараў, для праваслаўнай Люблінска-Холмскай епархіі за грунты страчаныя на Люблiншчыне. Несправядлівае такое залагоджванне старых крыўдаў новымі крыўдамі.

Дырэктар Ружанскі, пры здзіўленні зацікаўленых, адказаў:

— Гэта не датычыць закону аб нацыянальных і этнічных меншасцях. Я падазраваю, што гэта рашэнне Рэгуляцыйнай камісіі па справах Польскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. Кампенсацыі, выдзеленыя з грунтаў АСН, могуць быць выдзелены на тэрыторыі ўсяе краіны. З цікаўнасці, аднак, я спытаюся пра гэта.

І звярнуўся непасрэдна да Яна Морданя і спадарыні солтыс:

— Я рады, што вы ўдзельнічаеце ў гэтай сустрэчы як беларуская меншасць побач пана Сычэўскага.

У абарону сялян стаў старшыня Беларускага саюза ў РП Яўген Вапа:

— Гэтая справа цягнецца ўжо пару гадоў. Была тэмай пасяджэння сеймавай камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей. Кожная меншасць абараняе сваю зямлю, сваю ўласнасць. Гэтых сялян відавочна пакрыўдзіла сувальская фірма АСН. Гэтую працэдуру трэба паставіць пад пракурорскі нагляд. Інфармацыя пра таргі на зямлю паявілася пасля таго, як яны ўжо адбыліся.

Дырэктар Ружанскі:

— Не памятаю, каб гэтая тэма абмяркоўвалася на пасяджэнні сеймавай камісіі [дырэктар Ружанскі на сваёй пасадзе ў МУСіА паўтара года — М. Х.].

„Ніва" рашыла праверыць. Фактычна, было такое пасяджэнне, і то ўжо 26 лістапада 2003 года. Вяла яго дэпутатка ад „Самаабароны" Генавефа Віснёўская. Удзельнічалі ў ім м.інш. намеснік старшыні АСН Юзаф Пыргес і войт Бельскай гміны Яўгенія Асташэвіч. Гаворка была галоўным чынам пра няправільнасці ў правядзенні таргоў у вёсцы Парцава. Тады солтыс вёскі Райск Аляксандр Цішук вынес пытанне таргоў арганізаваных таксама ў яго вёсцы ды ў Гацьках і Храбалах. Далучыліся да яго са скаргай таксама солтыс Парцава Дзмітрый Артэмюк ды Ян Мордань.

У канцы мінулага года ў запыце накіраваным у МУСІА падляшскі дэпутат Роберт Тышкевіч заўважыў: „Пасля шматразовых заяў ды інтэрвенцый парламентарыяў і Міністэрства сельскай гаспадаркі, дырэкцыя АСН у Сувалках пагадзілася на частковае ўлічэнне спадзяванняў мясцовых сялян. У снежні 2003 г. [значыць зараз пасля пасяджэння сеймавай камісіі — М. Х.] абавязалася пісьмова, што спыніцца з трывалым размеркаванем грунтаў, якія актуальна арандуюцца на тэрыторыі гэтых вёсак да часу вясвятлення патрабаванняў мясцовых сялян. Незалежна ад успомненага абавязацельства, дырэкцыя філіяла АСН у Сувалках восенню 2006 г. перадала на ўласнасць праваслаўнай Люблінска-Холмскай епархіі 155 гекатараў на тэрыторыі вёскі Райск. Мясцовых сялян аб гэтым не паведамілі". Далей дэпутат успамінае аб тым, што на суседуючых з сабою вёсках Райск, Храбалы і Гацькі ёсць 15 сялян, якім трэба павялічыць сямейныя гападаркі, затое на Люблiншчыне ў распараджэнні АСН маецца больш за 10 тысяч гекатараў грунтаў, ды незалежна ад гэтага Люблінска-Холмская епархія атрымала зямлю ў вёсцы Райск. На пераломе студзеня і лютага 2010 года ад імя МУСіА Тамаш Сямоняк суха сказаў, якая была юрыдычная падстава гэтага рашэння, без адказвання на пытанні дэпутата Тышкевіча наконт прэтэнзій мясцовых сялян. Як здаецца, з юрыдычна-чыноўніцкага пункту гледжання, справа закрыта. Ды ці так ёсць у сапраўднасці?

Урочышча Легенда

Абавязкова ўсе турысты, якія знойдуць на карце Белавежскай пушчы гэтае ўрочышча, пачынаюць задумвацца над паходжаннем яго нетыповай назвы. Шмат з іх робіць здагадкі, якія надта размінаюцца з праўдай. А назва гэтая ўзнікла ў даволі празаічны, хаця адначасова і смешны, спосаб. Спярша трэба растлумачыць чытачу, што гаворка тут пра ўрочышча Легенда, што знаходзіцца ў 486 квартале пушчы, на тэрыторыі надлясніцтва Гайнаўка.

Магутны дуб ва ўрочышчы Легенда

Назва ўрочышча ўзнікла пасля II сусветнай вайны і па той прычыне яно адсутнічае ў „Спіску ўрочышчаў Белавежскай пушчы", састаўленым Янам Ежы Карпінскім у 1937 годзе.

Прабуючы высветліць загадку назвы ўрочышча Легенда, я сутыкнуўся з дзвюма версіямі яе ўзнікнення. Першую пачуў я ў 2002 годзе ад Анджэя Новака — тады яшчэ ляснічага, а зараз інспектара нагляду ў надлясніцтве Гайнаўка, які ў сваю чаргу гэтую гісторыю пачуў ад памерлага ўжо ляснічага Язэпа Шаршуновіча. Вось яна:

„Аднойчы працаўнікі надлясніцтва Гайнаўка, у тым ліку шматлікія вазакі, удзельнічалі ў абучэнні, якое вялі белавежскія навукоўцы, якраз на ўзбярэжжы 486 квартала. Навукоўцы нейкія тэмы тлумачылі пры дапамозе карты. Знізу карты віднеў надпіс вялікімі літарамі „Легенда", пад якім, зрозумела, знаходзіліся тлумачэнні знакаў на карце. Малаадукаваныя вазакі хіба не занадта зразумелі, што абазначае той надпіс. Ім здалося, што менавіта гэтак называецца той квартал. У іх гутарках часта можна было пачуць, што нехта едзе на Легенду. Служачыя надлясніцтва спачатку смяяліся з гэтага недаразумення, але з часам і яны пачалі карыстацца гэтай назвай".

Другую версію ўзнікнення назвы ўрочышча я запісаў крыху раней. Пачуў яе выпадкова ад невядомага мне па прозвішчы ляснога рабочага, які свайго часу працаваў у гайнаўскім надлясніцтве. Паводле яго тлумачэння, на лініі 486 квартала знаходзілася дошка з картай надлясніцтва. Час учыніў, а і напэўна хуліганы ў гэтым „дапамаглі", што з дошкі астаўся толькі яе ніжні фрагмент з надпісам „Легенда". Лясныя рабочыя палічылі гэтае слова назвай урочышча і пачалі ім карыстацца дзеля спраўнейшай арыентацыі ў лесе.

Пётр БАЙКО

1 ☞працяг

Напярэдадні перапісу

якія маюць доступ да інтэрнэту, а гэта таму, што будзе ён праходзіць у розных этапах і пры дапамозе розных прылад. Першым механізмам будзе адсочванне даных сабраных рознымі дзяржаўнымі ўстановамі, ад агульнапольскіх па маленькія гмінныя ўправы, але таксама прадпрыемствамі жыллёвага будаўніцтва ці пастаўшчыкамі энергіі. Чарговыя крокі будуць мець на мэце папоўніць падставовыя інфармацыі. З гэтай мэтай паявяцца ў нашых дамах перапісчыкі. Не ўсюды аднак паспеюць трапіць, таму частка перапісу адбудзецца па тэлефоне. Цікавае, што ў размове з прадстаўніком Галоўнай статыстычнай установы я даведалася, што мэтай тэлефонных апытанняў будзе, між іншым, пераканаць да самаспісу. Самаспіс у чарговым перапісе можа аказацца вельмі важнай прыладай здабывання інфармацыі, бо будзе адбывацца шляхам запаўнення інтэрнэт-анкеты. Варта падкрэсліць, што анкеты ў інтэрнэце таксама будуць часткова запоўненыя. **Абавязкам апытванага будзе не толькі пакінуць адпаведную інфармацыю, але праверыць і выправіць тое, што ўрад пра нас ужо ведае.** Перапіс пры дапамозе інтэрнэту нясе з сабой важныя карысці. Пазбягаючы кантакту з перапісчыкам, застаемся толькі і выключна самі са сваімі ведамі ды пачуццямі, якія непасрэдна перадаем установам, а наш удзел у перапісе **не фільтруецца трэцімі асобамі.** Штораз большая колькасць людзей мае неабмежаваны доступ да інтэрнэту таму варта заранёў задумацца над спосабам нашага ўдзелу ў набліжаючымся перапісе насельніцтва.

Паводле меркаванняў людзей, звязаных з рознымі меншаснымі асяроддзямі, перапіс можа аказацца вельмі важным. Украінцы, ведаючы дэмаграфічныя змены, асабліва ў галіне міграцый, разлічваюць на рост колькасці жыхароў украінскай нацыянальнасці. Гэтаму мае пасадзейнічаць таксама змена ў падыходзе да ўкраінцаў, якая прыйшла разам з аранжавай рэвалюцыяй. Зразумела, што гэта можа паўплываць перш за ўсё на непасрэдны кантакт з перапісчыкам і яго стаўленне да апытваных жыхароў. Пасол Сейма Рэчы Паспалітай ды адначасова прадстаўнік нямецкай меншасці Рышард Галля даволі ўпэўнена гаворыць пра прагнозы адносна перапісу:

— Здаецца мне, што пасля папярэдняга перапісу прыйшла канкрэтная рэфлексія, — кажа. — У яе выніку можам спадзявацца змены ў колькасці жыхароў перш за ўсё шлёнскай нацыянальнасці. Многія з іх запішуцца ў гэты раз немцамі.

Кожны лідар меншаснага асяроддзя зараз мяркуе і ацэньвае магчымыя вынікі. У першым артыкуле наконт перапісу насельніцтва ў 2011 годзе мы звярталі ўвагу на радыкальны спад колькасці жыхароў у гмінах, дзе пражываюць беларусы. Гэта не нясе з сабой столькі аптымізму, колькі прэзентуюць пасол Рышард Галля ці Пятро Тыма з Саюза ўкраінцаў у Польшчы. Там, дзе сітуацыя здаецца больш складанай, застаецца прамоцыя перапісу. Заканадаўства абавязвае ўсе дзяржаўныя ўстановы да прамоцыі перапісу. Вельмі важнае, каб не забывалі пра гэта гмінныя ўправы, бо яны найбліжэй чалавека. Жыхар гміны адчувае сувязь са сваёй мясцовасцю, гмінай і наогул мае больш даверу да дзеянняў мясцовых улад, чым далёкіх улад у Варшаве. У кантэксце нацыянальных і этнічных меншасцей гатовымі дапамагаць у прамоцыі перапісу з'яўляюцца таксама прадстаўнікі Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі.

— Ахвотна будзем удзельнічаць у сустрэчах па прамоцыі перапісу 2011 года, — кажа Дабеслаў Жамянеўскі, начальнік Аддзялення нацыянальных і этнічных меншасцей у Дэпартаменце веравызнанняў ды нацыянальных і этнічных меншасцей МУСіА. — Мы адкрытыя на прапановы меншасцей, але таксама мясцовых улад і будзем старацца адказваць на гэтыя патрабаванні. Між іншым, таму тэма перапісу, які і пытанні да перапісу былі кансультаваныя з сябрамі Супольнай камісіі ўрада і меншасцей у 2008 і 2009 гадах.

Новае заканадаўства прадбачвае таксама прамоцыю перапісу ў сродках масавай інфармацыі. Акцыя будзе весціся з 2 студзеня па 30 чэрвеня 2011 года. Для гэтага прадбачана 30 гадзін праграм у агульнапольскім тэлебачанні і 11 гадзін на Польскім радыё. Адпаведна па 40 і 19 гадзін плануецца на прамоцыю перапісу ў рэгіянальных асяродках тэлебачання і радыё. Хаця час гэты будзе фінансавацца з бюджэту паасобных медыяў, то заканадаўчы абавязак дае нам падставу верыць, што нашы СМІ справяцца з прамоцыяй. Аднак самае важнае, каб лакальныя гаспадары не забывалі пра гэту важную тэму. Ужо ў наступных артыкулах будзем сачыць за тым, што наконт перапісу будзе адбывацца ці ўжо адбываецца на розных узроўнях нашых мясцовых улад.

Падрыхтавала Ілона КАРПЮК

Зімовыя канікулы ў Орлі

Арлянскі Гмінны асяродак культуры стараецца прыгарнуць пад сваю апеку дзяцей і моладзь. І ў час канікул дзеці праводзяць там час вельмі цікава, а прытым бяспечна і карысна. Карысць ад гэтага таксама бацькам. Пра ўсе гэтыя справы папрасіў я расказаць Анну Несцярук, дырэктар Асяродка.

Гмінны асяродак культуры ўжо цыклічна ладзіць зімовыя канікулы дзецям і штогод яны іншыя ў тым сэнсе, што ў ліку атракцыёнаў з'яўляюцца такія навінкі, якіх раней не было. Ёсць і пастаянныя формы працы, якіх таксама не цураемся.

І так, сёлетнія канікулы, якія працягваліся з 25 студзеня да 5 лютага, адбываліся заадно ў памяшканнях ГАКу і школьнага комплексу — бо ў іх арганізацыі шчыльна супрацоўнічаем са школай.

27 студзеня нашы дзеці і моладзь наведалі заставу Памежнай аховы ў Дубічах-Царкоўных; транспарт запэўніла Гмінная ўправа і адну машыну выдзелілі пагранічнікі. Дзеці пабачылі канцылярыі, камеру папярэдняга зняволення і заслухалі інфармацыю пра працу органаў пагранаховы. Пасля паехалі ў Белавежскую пушчу, дзе было сарганізаванае вогнішча ды спаборніцтвы па пнеўматычнай стральбе.

2 лютага адбыліся два турніры. Упершыню ладзілі мы спаборніцтвы па вудзільным кіданні. Адбыліся яны ў гімнастычнай зале нашай школы, а ўдзельнічалі ў іх вучні з Беластока, Саколкі, Васількава, Бельска-Падляшскага і Орлі. Спаборнікі цэлілі ў мішэнь снарадам, зачэпленым на лёсцы. Спаборнічала шмат дзяўчат, асабліва з Васількава ды ад нас, з Орлі. Агулам удзел у гэтым мерапрыемстве прыняло каля сарака дзяцей; узнагародамі былі дыпломы і кубкі. Пасля мерапрыемства дзеці з'елі абед у школьнай сталовай.

4 лютага ў гімнастычнай зале адбыўся пінг-понгавы турнір, у якім прыняло ўдзел 26 вучняў з Арлянскай гміны. Перамог Тамаш Стасюк. Удзельнікі атрымалі дыпломы і кубкі, а пасля частаваліся салодкімі ласункамі.

На заставе Памежнай аховы ў Дубічах-Царкоўных. Старшы харунжы Міраслаў Садоўскі прэзентуе транспартныя сродкі, якімі карыстаюцца пагранічнікі

У час канікул нашы дзеці выязджалі на купальны басейн у Бельску-Падляшскім. Малодшыя дзеці ездзілі ў Музей беларускай культуры ў Гайнаўцы, дзе глядзелі фільм; была гэта казка пра паўночнага аленя, які ратуе свет. Пасля дзеці наведалі выставачныя залы. У завяршэнне канікул, пасля вяртання з Гайнаўкі, адбылася невялікая дыскатэка з грыміраваннем.

Арганізуем такія канікулы, каб дапамагчы дзецям добра правесці час. Адбываліся ў нас і кулінарныя заняткі, і більярдавыя спаборніцтвы, дзеці крыху пасядзелі за камп'ютарамі, карысна правялі час. Нашы дзеці не бадзяюцца па Орлі, бо ў нас маюць распісаныя на канкрэтныя гадзіны заняткі. Займаліся не толькі арлянскія дзеці, але і з Кашалёў, Міклашоў ды Шарнёў; давозілі іх бацькі.

Хачу падкрэсліць, што такія канікулы будзем праводзіць надалей, бо бачым, што яны дапамагаюць актыўна праводзіць час. Наша праграма канікул цікавая, прыцягвае дзяцей, штогод маем новых ахвотных. Заўсёды перад канікуламі апрацоўваем лістоўкі з праграмай, якія апекуны раздаюць дзецям, а тыя прадстаўляюць іх сваім бацькам, і бацькі прымаюць рашэнні. Спачатку, некалькі гадоў таму, займаліся ў нас толькі дзеці з самой Орлі, а зараз прыязджаюць і з суседніх вёсак.

У ранейшых гадах такія канікулы ладзілі мы за сродкі арлянскай Дабравольнай пажарнай каманды, дзе вялася апрацоўка праектаў, а цяпер ладзім іх за сродкі з нашага, ГАКу, бюджэту, Гміннай управы і Гміннай камісіі вырашання алкагольных праблем.

Заняткі праводзім па-рознаму, найбольш размаўляем па-польску, але часам і па-свойму. У нас прыняўся такі звычай, што калі хто загаворыць па-польску, то і мы так з ім размаўляем.

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

„Цётухна, а дзе тут у вас радыяцыя, дзе яна — нябачная смерць? — А дзе стаіце, — там і смерць".

Смерць... боль... быль... Чарнобыль.

Тэатр беларускай драматургіі ў Беластоку

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

— Гэта наш першы візіт у Беластоку. Прыбылі мы са спектаклямі па запрашэнню Генконсульства РБ, наладзім таксама кантакты з Драмтэатрам імя Аляксандра Вянгеркі. Мы даволі часта прыязджаем у Люблін, бываем на фестывалях, на „Канфрантацыях". Наш тэатр у студзені гэтага года адзначыў дваццацігоддзе, — кажа дырэктар тэатра, прафесар Валерый Данілавіч Анісенка, які ў 2000 годзе гэты тэатр узначаліў, заслужаны дзеяч мастацтваў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Пад яго кіраўніцтвам Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі пачаў перажываць якасна іншы этап сваёй гісторыі, які можна ахарактарызаваць імкненнем да пастаяннага развіцця, творчага пошуку ў рэчышчы псіхалагічнага тэатра. Толькі за перыяд 2000-2005 гг. адбылося 25 прэм'ер. Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі добра вядомы не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. На яго рахунку шматлікія гран-пры і прэстыжныя ўзнагароды міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў тэатральнага мастацтва, між іншым на „Прыбалтыйскіх тэатральных сустрэчах" на 49-ым і 50-ым Міжнародных эдынбургскіх фестывалях са спектаклямі „Рычард III" і „Макбет" У. Шэкспіра; 1-ым фестывалі нямецкамоўнай драматургіі са спектаклем „Бот і яго шкарпэтка" (Мінск, 1998 год); „Славянскіх тэатральных сустрэчах" са спектаклем „Апошняя пастараль" паводле аповесці Алеся Адамовіча (Бранск, 1999 год); 1-ым Міжнародным фестывалі сучаснага тэатра „Адкрыты фармат"; „Славянскіх тэатральных сустрэчах" са спектаклем „Адвечная песня" Я. Купалы (Гомель, 2003 год). У 2007 годзе „Адвечная песня" атрымала Гран-пры IX Міжнароднага тэатральнага фестывалю „Галасы гісторыі" (г. Волагда, Расія, 2007 г.). Самы тытулаваны спектакль тэатра „Жанчыны Бергмана" сабраў прызы наступных фестываляў: „Славянскія тэатральныя сустрэчы" (Бранск, 2002 год); IX Міжнародны тэатральны фестываль (г. Сібіу, Румынія, 2002 год); Міжнародны тэатральны фестываль у Каіры (Егіпет, 2003 год); Міжнародны тэатральны форум „Залаты Віцязь" (Масква, 2003 год). Спектакль „Сёстры Псіхеі", пастаўлены ў 2007 годзе, таксама паспеў прынесці нашаму тэатру прэстыжную ўзнагароду — Гран-пры на Фестывалі антычнага мастацтва „Баспорскія агоны" (г. Керч, Украіна, чэрвень 2007 г.).

— Тэатр-лабараторыя беларускай драматургіі быў створаны ў 1990 годзе з мэтай аказання практычнай дапамогі беларускім драматургам-пачаткоўцам у спасціжэнні законаў сцэны і з'яўляецца адным з нешматлікіх тэатраў такога кшталту разам з тэатрам „Рэйэл-Корт" у Лондане і Школай сучаснай п'есы ў Маскве. Першым кіраўніком тэатра стаў заслужаны дзеяч мастацтваў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Валерый Мазынскі. Школу Тэатра беларускай драматургіі прайшлі ўжо каля трох дзесяткаў маладых аўтараў, сярод іх Мікалай Арахоўскі, Уладзімір Савуліч, Ігар Сідарук, Мікалай Казачонак, Міраслаў Адамчык, Максім Клімковіч, Раіса Баравікова, Дзмітрый Бойка, Уладзімір Сцяпан, Сяргей Кандрашоў, Мікалай Рудкоўскі, Вячаслаў Панін, Андрэй Карэлін, Андрэй Шчуцкі, Андрэй Курэйчык і іншыя. З тэатрам супрацоўнічаюць таксама майстры беларускай літаратуры Алена Папова, Сяргей Кавалёў, Георгій Марчук, Яўген Таганаў, Святлана Алексіевіч. Разам з маладой драматургіяй тэатр ажыццяўляе пастаноўкі твораў сусветнай класікі на беларускай мове (Шэкспір, Брэхт, Мальер, Чэхаў, Булгакаў).

— Цяпер большасць акцёраў у нашым тэатры гэта былыя мае студэнты, выпускнікі Універсітэта культуры, — з гонарам кажа дырэктар тэатра. — Тэатр можа ганарыцца і адкрыццём новых імёнаў у рэжысуры: значны ўнёсак у дзейнасць тэатра робіць заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Таццяна Рыгораўна Мархель...

Яна іграла ролю Жанчыны ў спектаклі „Чарнобыльская малітва" паводле кнігі Святланы Алексіевіч:

— У фінале ў мяне маналог жанчыны, якая сем гадоў жыве адна ў адселенай вёсцы, з якой усе выехалі, іншыя памерлі. Гэта так страшна — лёс чарнобыльскай вёскі, яе жыхароў, лёс маёй гераіні. Але я іграю светла, без надрыву. Напрыклад, у заключнай сцэне расказваю, як тут хораша, як прыгожа ў гэтай вёсцы. Коцік памёр, а яна знайшла другога — усё ж жывая душа, разам весялей. Яна радуецца таму жыццю, якое ёсць. Каб яна адчувала трагедыю свайго становішча, то даўно памерла б. Жыве таму, што ёй тут хораша, радасна на роднай зямлі. І птушкі спяваюць, і ўсё навокал цвіце, ніякай жа радыяцыі не відаць. Яна прыходзіць на могілкі праведаць тых, хто там ляжыць пад карэньчыкамі, гаворыць з імі, а тут і зязюлька закукавала. Песню «Ляцела зязюля каля маёй хаты», якую я спяваю там, пачула ўпершыню ад жанчын з Лельчыцкага раёна, калі вяла тэлепередачу «Запрашаем на вячоркі». І вось гучыць песня ў спектаклі, а разам з ёю і галасы тых, хто там ляжыць на могілках, як голас зямлі. Я трымаюся да апошняга, не плачу, вельмі светла ўвасабляю гэты вобраз, але мне так страшна...

У спектаклі пра чарнобыльскую трагедыю гучаць песні ў выкананні Таццяны Мархель, якія адпісала ад сваёй маці Веры Кірылаўны ў вёсцы Шпакоўчышна Смалявіцкага раёна.

Святлана Алексіевіч нарадзілася ў Івана-Франкоўску (Украіна) у сям'і вайскоўца. Пасля дэмабілізацыі бацькі сям'я вярнулася на яго радзіму, у Беларусь. Скончыла факультэт журналістыкі БДУ (1972). Аўтарка кніг „У вайны не жаночы твар", „Апошнія сведкі", „Цынкавыя хлопчыкі", „Зачараваныя смерцю", „Чарнобыльская малітва", „Дзіўны алень вечнага палявання". Кнігі выдадзеныя больш як у 20 краінах свету. Лаўрэат шматлікіх міжнародных літаратурных прэмій. У Беларусі кнігі Алексіевіч не друкуюцца вось ужо 12 гадоў (калі не лічыць кнігі, выдадзенай прыватным чынам Сяргеем Законнікавым). Святлана Алексіевіч — найчасцей выдаваны сучасны аўтар у Японіі, нядаўна яна атрымала Нацыянальную прэмію крытыкаў ЗША. Але ў роднай Беларусі кнігі Святланы Алексіевіч не выдаюць. Святлана Алексіевіч пра кнігу „Чарнобыльская малітва": „Я думаю, што „Чарнобыльская малітва" — насамрэч хроніка будучыні. Яна выйшла за межы досведу нейкай адной сістэмы, адной ментальнасці, хаця тэма вайны таксама выходзіць за гэтыя межы, каб кніга была не мясцовага спажывання, кніга павінна выйсці на тую кропку інтэлектуальнага накаплення, якое існуе ў свеце, каб гэта было цікава ўсім, а не толькі на „вясковым выгане". Іначай не варта пісаць — таму я настолькі доўга пішу свае кнігі.

Спектакль-рэпартаж, сціпла і строга сцэнічна афомлены (на чатырнаццаці пяньках, якія пасля стануць узгалоўямі магіл, сядзяць героі, якія, здавалася б, як найбольш стрымана і аб'ектыўна, у простых словах, як у гамонцы, выяўляюць сваё гора, пытаюцца, крычаць). Тут і жонка ліквідатара, узнагароджанага медалём, які памёр у страшэнных пакутах, дзяўчынка, маці, перасяленцы, вучоны, суседзі, хворыя людзі... „Узарваўся Чарнобыль, узарваўся камунізм", чалавек, якога абманваюць, са сваёй бядой і болем застаецца адзін. І невядома хто ён, — у яго няма радзімы. Яны „савецкія людзі". На краіну ўзвальваюцца сотні кілаграмаў стронцыю, 450 відаў радыёнуклідаў. Народ умірае, паміраюць ідэі. „Ды трэба жыць, выйсця ў нас няма". На памерлай зямлі, якая жыве сваім жыццём, застаецца Жанчына. Яе і мёртвыя слухаюць. Яна сведка і збавіцелька. Яна сама памяць. Так як і Святлана Алексіевіч, сведка і тая, хто захоўвае нашу балючую памяць.

Спектакль паказваўся таксама ў Гайнаўцы і Бельску.

Адышоў прафесар Васіль Белаказовіч

У суботу, 20 лютага, а 19.36 я ўжо традыцыйна званю свайму дзядзьку, праф. Васілю Белаказовічу. Трубку падымае цётка Тамара. Чую ад яе сумныя звесткі. Прафесар у сераду 17 лютага ўвесь дзень чакаў у чарзе да лекара, атрымаў інфаркт і ў цяжкім стане ў спячцы ляжыць у шпіталі. Ад хвалявання не магу доўга гаварыць. Размова працягваецца ўсяго 14 хвілін і 13 секунд. У мяне найгоршыя прадчуванні, хоць голас у трубцы спакойны. Нягледзячы на тое, выказваю надзею, што ўсё будзе добра. Хачу такім чынам падтрымаць на духу цётку Тамару.

Пасля гэтага а 20.16 званю яшчэ Віктару Шведу. У трубцы на працягу ўсёй размовы чутны выразны трэск. Інфармую паэта пра стан здароўя прафесара. Спадар Віктар выказвае свой вялікі жаль, а пасля пападае ў цяжкі псіхічны стан. З паэтам гавару крыху даўжэй — 22 хвіліны 38 секунд.

У нядзелю з самага ранку еду на заняткі ў Седльцы. Я ў ненайлепшым настроі. У такім стане вяду заняткі са студэнтамі, у тым ліку і з Паўночнага Падляшша. Прыбіты, вяртаюся ў гатэль. Увесь вечар сумны. Думаю ці не пазваніць цётцы Тамары. Але нават гэтага баюся.

А 20.32 высылаю кароткую эсэмэску сяброўцы Ірыне ў Кіеў, а затым наступную а 22.11, у якім пішу пра стан здароўя дзядзькі. Яшчэ нават наступнага дня а 19.05 Іра пытае мяне пра стан здароўя дзядзькі. А 22.08 адказваю ёй, што баюся найгоршага...

Не ведаю яшчэ аб тым, што дзядзька ўжо не жыве. Памёр з суботы на нядзелю 21 лютага пасля поўначы. Пра тое скажа мне пазней цётка Тамара, а ўпершыню пра ягоную смерць даведаюся ад д-ра Янкі Трахімюка, які двойчы паспрабуе мне пазваніць падчас майго вяртання ў Люблін у аўторак 23 лютага (другі раз а 16.27). На жаль, тэлефон у партфелі. І нават баюся ўжо яго падымаць. Дазвоніцца толькі на інтэрнэтны нумар а 22.34, ледзь не плачучы. Гаворым 12 хвілін і 13 секунд.

Смерць майго дзядзькі аплаквалі шматлікія вучоныя, нават прафесары. Пра тое даведаюся я пазней ад дэкан, д-р Людвікі Язукевіч-Асэлкоўскай. На другі дзень званю цётцы Тамары...

Юрка ТРАЧУК

Адышоў мой зямляк

Памёр мой аднавясковец Васіль Белаказовіч, з якім сустракаўся я ў Ольштыне. Працаваў Ён у Інстытуце ўсходняй Славяншчыны Вармінска-Мазурскага ўніверсітэта ў Ольштыне. Ушанаваны Ён быў званнямі ганаровага доктара ўніверсітэтаў у Калінінградзе і Ніжнім Ноўгарадзе. Быў сябрам рэдкалегій часопісаў „Studia Polono-Slavica Orientalis", „Slavia Orientalis" ды ольштынскіх штогоднікаў „Acta Polono-Ruthenica".

Апублікаваў за чатырыста прац з галіны рускай, беларускай, украінскай, літоўскай ды іншых літаратур. Займаўся літаратурнай польска-ўсходнеславянскай кампаратыстыкай, польска-рускімі літаратурнымі кантактамі XIX і XX стагоддзяў. Быў аўтарам шматлікіх манаграфій на згаданыя тэмы.

Спачуваю, разам са сваімі блізкімі, сям'і пакойніка.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Ты чаго брэшаш на майго сабаку?!

На Беласточчыну прыехаў з Мінска сучасны Тэатр беларускай драматургіі. Прывёз пастаноўку таксама і для нашых дзетак: „Гісторыю двух сабак". Хоць пастаноўка для малодшых, а можа перш за ўсё таму — яна таксама вельмі добрая і сучасна афармлена. А з якой іскрай іграюць ролі двух сабак акцёры, якія ўмеюць быць і трагічнымі! І гісторыя не проста „сабачая", а пра жыццё. Пачуем і пафіласофствуем з героямі — Булькай і Дунаем. Ахвотна пабачаць п'есу не толькі дзеці але і іх бацькі і бабулі ды дзядулі. Вось у парку сустракаюцца лабрадор Дунай і французская бульдожка Булька. Іх у розныя часы прывезлі сюды гаспадары і кінулі. А хутка зіма... Сабакі хочуць знайсці сабе новых гаспадароў, але ж гэта вельмі няпроста, бо колькі ў горадзе жыве злых і небяспечных людзей! Але Дунай і Булька вераць у тое, што іх дабрыня і адданасць абавязкова каму-небудзь будуць патрэбныя. А той, хто верыць у дабрыню, абавязкова яе сустрэне. Людзі не разумеюць мовы сабак, але вельмі добрыя людзі малайцы: яны яе разгадваюць. А такія вось персоны выступаюць там: добрыя людзі настаўніца Тамара Іванаўна ды тата Алег Пятровіч, багацей Дзяніс Сяргеевіч (ён жа кінуў Дуная!), вельмі злы тып Анціп, апякун звяроў у прытулку Васіль Сямёнавіч. Знойдуць сабакі сваіх добрых людзей, а нават іх і пажэняць!

Аж сляза ў воку закрунецца добраму чалавеку!

Дзеці ў вялікай глядзельнай зале ўсенька разумелі! Бо ж яны лепш памятаюць мову сабак. А яшчэ і беларускую мову!

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

25 сакавіка

Вось вясна, у душы таксама.
Разам з намі тата, мама,
усе мы разам маем свята.
Усіх беларусаў дата.
Адраджэнне дум і мар.
Неба светлае без хмар.
І ляцяць па небе гусі
да сардэчнай Беларусі.

Міра ЛУКША

Алена Кобец-Філімонава

Сем мастакоў

У адным горадзе жылі-былі сем мастакоў. Горад, у якім яны жылі, быў вельмі змрочны. Таму што над ім віселі шэрыя хмары. І ад іх на ўвесь горад падаў шэры цень. З-за хмараў не было відаць аранжавага сонца. Не было відаць зялёнай лістоты. Не было відаць блакітных нябёсаў. І ўсё, што малявалі мастакі, было шэрае і непрыгожае. Яны ж думалі, што неба можа быць толькі шэрага колеру. І лісце толькі шэрага колеру. І ўсё наўкола — толькі шэрага колеру. Таму і фарбы ў іх былі толькі шэрыя. Яны не маглі маляваць іначай.

Аднойчы ў горад прыляцеў вецер і разагнаў хмары. Мастакі выбеглі на вуліцу — і не паверылі сваім вачам.

— Ой, якое прыгожае неба! — сказалі яны.

— Ой, якое прыгожае сонца! — сказалі яны.

— Ой, якое прыгожае лісце! — сказалі яны.

І адразу пачалі маляваць. Але атрымалася непрыгожа. Таму што ў іх была толькі шэрая фарба.

Сем мастакоў цяжка ўздыхнулі. Што ж ім рабіць? Як навучыцца добра маляваць? Тады адзін з іх сказаў:

— Сябры! Хадзем фарбы шукаць.

Узялі мастакі сем пэндзлікаў і сем вядзерцаў і пайшлі фарбы шукаць. Доўга вандравалі яны па белым свеце і ўсяму дзівіліся. А дзівіцца было чаму. Яны ж усё жыццё жылі ў змрочным горадзе і не ведалі, што ёсць на свеце пунсовы-пунсовы мак, які квітнее на зялёным лузе; што ёсць бялюткі рамонак з залацістай сярэдзінай; што сонца ўдзень аранжавае, а ўвечары — малінавае. Яны любаваліся прыродай, многае спазнавалі і ўсё запаміналі.

Аднойчы мастакі падняліся на вяршыню самай высокай гары. Адтуль было відаць усё навокал: і рэкі, і лясы, і лугі — увесь шлях, які яны прайшлі. Залюбаваліся мастакі і пачалі марыць:

— Ах, як бы я хацеў намаляваць мак! — сказаў адзін.

— А я — сонца! — сказаў другі.

— А я — дзьмухавец! — сказаў трэці.

— А я — лісточак! — сказаў чацвёрты.

— А я — неба! — сказаў пяты.

— А я — званочак! — сказаў шосты.

— А я — фіялку! — сказаў сёмы.

І як толькі яны гэта сказалі — на небе ўзнікла вясёлка. Убачылі мастакі вясёлку — і вачам сваім не паверылі.

— Ах, якія фарбы! — уздыхнулі яны.

— Я бачу фарбу, як мак! — сказаў адзін.

— А я — як сонца! — сказаў другі.

— А я — як дзьмухавец! — сказаў трэці.

— А я — як лісточак! — сказаў чацвёрты.

— А я — як званочак! — сказаў шосты.

— А я — як фіялку! — сказаў сёмы.

І раптам адзін канец вясёлкі апусціўся каля самых ног мастакоў. І яны ўбачылі сем каляровых дарожак.

Чырвоную, як мак.

Аранжавую, як сонца.

Жоўтую, як дзьмухавец.

Зялёную, як лісточак.

Блакітную, як неба.

Сінюю, як званочак.

Фіялетавую, як фіялка.

— Ура! — закрычалі мастакі. — Нарэшце мы знайшлі фарбы!

Кожны выбраў сабе любімую дарожку і пайшоў па ёй. Прайшлі мастакі па ўсёй вясёлцы. І адразу ж пачалі маляваць. Ім не цярпелася даведацца, якога колеру фарбы ў іхніх вядзерцах.

Узялі мастакі вялікі ліст паперы, і кожны па чарзе правёў па ім лінію сваім пэндзлікам. Атрымалася яркая, сямі колераў вясёлка. Мастакі былі шчаслівыя. Цяпер яны маглі намаляваць усё, пра што марылі.

А што сталася з вясёлкай? Яна знікла. Таму што аддала ўсе свае фарбы. А калі пойдуць яе шукаць іншыя мастакі, яна зноў з'явіцца і аддасць ім свае новыя фарбы.

Ягуштова (2)

Царква св. Ануфрыя

У нашым цыкле сустрэч з цікавымі падляшскімі мясцовасцямі працягваем наш візіт у Ягуштова, што каля Бельска-Падляшскага.

Гаворачы пра Ягуштова і цікавыя месцы ў ім, нельга забыць пра драўляную царкву св. Яна, якая знаходзіцца на могілках пры выездзе з вёскі. Царкву пабудавалі у 1870-х гадах. Раней жыхары Ягуштова былі бельскімі прыхаджанамі. Пасля заснавання прыхода надалей ён абслугоўваўся бельскімі святарамі.

Калі аналізуем цікавыя месцы Ягуштова і ваколіц, варта таксама згадаць царкву св. Ануфрыя, якая належыць да Стрыкоў, але ад самога Ягуштова аддаленая няшмат. Храм пабудавалі ў 1814-1816 гадах на старых могілках, якія служылі жыхарам Ягуштова і Стрыкоў.

Вельмі цікавая з'ява ў Ягуштове — захаваныя па сённяшні дзень характэрныя прозвішчы. Вынікае гэта з факту, што яшчэ да нядаўніх часоў жыхары Ягуштова жаніліся ў большасці толькі з людзьмі са сваёй вёскі. Гэты няпісаны звычай захаваў шмат ягуштоўскіх прозвішчаў з канчаткам *-іч* (Канаховіч, Плютовіч, Бусловіч).

Ягуштова надалей застаецца вялікай вёскай, хаця жыхароў тут менш чым раней. У вёсцы знаходзіцца вялікая школа — падставовая і гімназія. У апошняй вучацца гімназісты з Бельскай гміны. Варта дадаць што вучні і настаўнікі школы рэалізуюць шмат цікавых праектаў, напрыклад, „Краіна Ягуштово", у час якога вучні запісалі старадаўнія назвы палёў і ўрочышчаў у наваколлі. Дзякуючы гэтаму праекту сёння ў ваколіцах вёскі можам знайсці стэнды з інфармацыяй пра тое, як калісь называлі гэты ці іншы луг ды поле.

Міхась СЦЕПАНЮК

Падтрымаць Свята Незалежнасці!

25 сакавіка, вядомае як Свята Волі, у апошнія гады набыло дзіўна агрэсіўны воблік. Такая думка з'явілася ў мяне пасля знаёмства з беларускімі сайтамі, прысвечанымі Святу Незалежнасці. На першым месцы там трывожныя фотарэпартажы з шэсцяў пад бел-чывона-белымі сцягамі. Іх удзельнікаў, пераважна маладых дзяўчат і хлапцоў, жорстка збівае міліцыя. Льецца кроў, прымяняецца насілле. Словам жах! Падобныя кадры час ад часу паказвае тэлебачанне. Глядзіш і баішся беларускай „незалежнасці"...

На Свята Незалежнасці мы павінны глядзець з уласнага „панадворка". 25 сакавіка кожны год адзначаюць у Беластоку, Бельску, Гайнаўцы. З нагоды свята будынкі нашых белліцэяў і некаторых школ упрыгожваюць бел-чырвона-белымі сцягамі, ладзяць лінейкі, турніры. Часта ў класе з'яўляюцца спецыяльныя насценгазеты. Гадавіне прысвячаюць асобныя ўрокі, часам запрашаюць гасцей, дэманструюць гістарычныя фільмы. Асабліва прыемна 25 Саквіка святкуюць на Узбярэжжы Польшчы і ў Беластоку. На свята прыходзяць цэлыя сем'і, часта з маленькімі дзяцьмі. Пасля г.зв. афіцыйнай часткі, дзе на першым месцы прамова прэзідэнта БНР Івонкі Сурвілы і супольнае спяванне незалежніцкага гімна „Мы выйдзем шчыльнымі радамі", усе сустракаюцца за сталом — ці то ў кавярніі, ці ў назначаным памяшканні. Звычайна на такія сустрэчы запрашаюць бардаў, тэатр або прапануюць аўтарскія сустрэчы. Моладзь прыходзіць па сваёй волі, найперш, каб пабыць разам з сябрамі з іншых школ або гарадоў. Праўда, такая з'ява свабоднага святкавання ў нас афіцыйна вядзецца пасля 1989 года, калі ў Польшчы пайшлі дэмакратычныя працэсы. Традыцыя існавала ўжо ў даваенны час. Пасля 1945 года Свята Волі ўшаноўвалі беларускія эмігранты ў ЗША, Канадзе, Аўстраліі, Францыі, Вялікабрытаніі, Нямеччыне... Іх прыклад у многім дапамог зразумець нам сэнс святкавання падобных урачыстасцей. Сёння мы таксама можам дапамагчы сваім сябрам з Беларусі. Якім чынам? Менавіта паказваць нашу мадэль святкавання: распавесці пра файны канцэрт, сустрэчу з сябрамі, супольныя ініцыятывы. Адной з такіх нармальных праяў святкавання з'яўляецца хоць бы ўдзельніцтва ў конкурсе „Зоркі", арганізаваным з нагоды свята. Нас цешыць зацікаўленне нашай прапановай (адказы можна дасылаць да 25 сакавіка). Ваш удзел, які заключаецца ў пашырэнні ведаў пра БНР, найлепшая падтрымка сяброў, якія свабодна не могуць адзначаць Свята Незалежнасці.

ЗОРКА

Музыка з кайфам

Несіметрычны Андрэй

Калі здаецца вам, што чалавек сіметрычны, бо мае двое супрацьлеглых вушэй ці дзве такія ж нагі, то абсалютна памыляецеся! Гляньце ў люстэрка і параўнайце выгляд свайго носа ці ўвогуле профілю твару з правага і левага бакоў. Падобныя? Пэўна, што так! Але ці сіметрычныя?.. Ну вось... Чалавек увогуле несіметрычны. Ён адзіны ў сваім родзе. Хочацца сказаць — адзіночны. Добра гэта разумее сучасны беларускі літаратар Андрэй Хадановіч і ў сваёй навейшай кнізе расказвае пра несіметрычнасць. Андрэя, так як і кожнага з нас, не заступіш нейкім дублёрам. Толькі мы так умеем дыхаць, па-свойму, толькі ён так умее пісаць. Але чаму ў музыцы з кайфам гутарка пра паэта? Ужо неаднойчы пераконвала я вас, што музыка з паэзіяй пераплятаюцца, нават ідуць у пары. Але Андрэй Хадановіч не да канца такі выканаўца як Алесь Камоцкі, які піша музыку на вершы розных паэтаў, гэта не тое, калі гарадоцкая „RIMA" ці „ILO&friends" спяваюць песні на словы Алеся Аркуша і Анатоля Сыса. Зусім не тое. Андрэй Хадановіч музыкай насычае сваю творчасць або, наадварот, сваёй творчасцю насычае музыку. Гэта не такая складаная справа як вам здаецца. Ён перш за ўсё вельмі любіць музыку. Апошняя яго кніжка „Несіметрычныя сны" гэта зборнік вершаў і дыск з узбагачаным музычнымі аранжыроўкамі зместам. Пару гадоў таму здарылася яму апублікаваць „Абменнік" — падборку літаратурных аповедаў з музыкай. На гэтым не канчаецца яго музычная дзейнасць. Можа помніце гурт „Індыга"? Пару гадоў таму яшчэ быў ён вельмі папулярным рок-гуртом у Беларусі, але музыкі пайшлі далей у сваіх пошуках і зараз займаюцца іншымі музычнымі праектамі. У памяці іх фанатаў застанецца аднак факт, што частку слоў да іх песень напісаў выдатны сучасны беларускі паэт Андрэй Хадановіч. І да гэтага яшчэ невыпадкова, толькі спецыяльна для іх, а гэта гонар.

Можа і Андрэй не мае голасу Кулінковіча, ні Вайцюшкевіча, затое спяванне дае яму вельмі многа радасці. Не зважаючы на нішто, спявае напісаныя сабою песні. Мае гэта свой камерцыйны бок. Андрэй Хадановіч вядомы сваімі патрыятычнымі тэкстамі да музыкі вялікіх сусветных гітоў. Можам пералічыць тут хаця б „Гатэль Беларусь" на музыку „Hotel California" гурту „The Eagles" ці „Вожык-патрыёт" на „Yellow Submarine" гурту „The Beatles". Адным словам Хадановіч гэта наш Андрэй-патрыёт!

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 12

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 8:

На, яда, мак, святло, свечка, мяч, анёл, метал, Лі, характар. Вяз, смех, асвета, вечар, мяч, хатка, клан, Ёла, Ас, клір.

Узнагароды, кашулькі з лагатыпам Радыё Рацыя, выйгралі **Паўліна Паплаўская, Дыяна Галёнка, Віялета Дработка** з Бельска-Падляшскага, **Івона Анішчук, Агнешка Анішчук** з Дубін, **Оля Галёнка** з Арэшкава, **Малгажата Гаворка** з Гайнаўкі. Віншуем!



Да 85-годдзя ПАЭТА

Віктар Швед

Сяброўства

Сяброўства дадзенае Богам –
Веліч пачуццяў і падзей.
Яно да сэрц людскіх дарога,
Трэба любіць, кахаць людзей.

Ласка і дабрыня яднае,
А без любові — жыць дарма,
Ніхто не любіць, не кахае
Калі ў нас еднасці няма.

Новыя алтары

У другой палове прошлага стагоддзя
Маім заданнем у жыцці найпершым –
У роднае прыехаць асяроддзе,
Сялянам-беларусам чытаць вершы.

З сардэчным сустракаўся я прыёмам,
Верш успрымаўся з захапленнем.
Мяняліся абставіны, вядома,
Прыходзілі на змену пакаленні.

Спыніліся сустрэчы з землякамі
І вершам не хапае ўжо даверу.
Прад тэлевізарамі-алтарамі
Вясковыя тырчаць пенсіянеры.

Наша паэзія

Niech poeci piszą wiersze
prostsze od wspaniałej poezji.
ks. Jan Twardowski

Кажуць, паэты згодны з модай,
Аб форму надта дбайныя.
Пішуць паэзію заўсёды
Цудоўна-незвычайную.

Часта паэзія, вядома,
Заблытана-ўмелая,
Не падабаецца нікому –
Яна незразумелая.

А трэба чытачам найпершым
Пісаць не надта з модаю,
Ды так пісаць, каб нашы вершы
Былі ім асалодаю.

Каб вершы ў сэрцы гасцявалі
І з памяццю ядналіся,
Каб на паліцы не ляжалі,
Ды толькі скрозь чыталіся.

Мой лес

Ажыццявіла мяне маці
У старой драўлянай хаце.
У калысцы з дрэў карэнняў
Рос, як маё пакаленне.

Стравы лыжкаю драўлянай
Смакаваў я пастаянна.
За смаляным сталом сасновым
Я першыя крымзолі словы.

Са сціплым сшыткам з дрэў паперы
У паэтычны свет паверыў.
Сухія дрэвы ў хлебнай печы
Грэлі ў хаціне мае плечы.

У ложку з габляваных дошак
Я ноччу сніў шмат сноў харошых.
З маткай грыбы я ў лесу ценю
Збіраў у кошык з дрэў карэнняў.

І лес прызначыў свае лішкі
На з вершамі мае ўсе кніжкі.
Я ўжо стары, лес улюбёны
Дасць дамавіну пасля скону.

Вера

Бацькі найдаражэйшыя на свеце,
Пашана ім, любоў і наш паклон.
Заўсёды памятаюць аб іх дзеці
Да жыцця свайго апошніх дзён.

А калі адыдзем за бацькамі,
Калі аб нас ужо загіне слых,
Верым, што будзем жыць і мы таксама
У сэрцах блізкіх, тых, яшчэ жывых.

У гонар славутага Васіля Быкава

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Вядучай тэмай XVI Алімпіяды беларускай мовы была творчасць класіка беларускай літаратуры, змагара за незалежнасць і дэмакратыю ў Беларусі Васіля Быкава. Тэмы пісьмовых работ, якія патрабавалі ад ліцэістаў ведання прозы Васіля Быкава, паявіліся на ўсіх этапах алімпіяды і таму была вельмі добрая нагода, каб на ўроках беларускай мовы больш увагі адвесці творчасці гэтага пісьменніка. Калі былі вылучаны пераможцы школьных элімінацый алімпіяды, настаўнікі беларускай мовы працавалі з імі на пазакласных заняткох, аналізуючы творчасць Быкава.

— Васіль Быкаў гэта вядучы пісьменнік у гісторыі беларускай літаратуры. Вялікім недаразуменнем і віной свету з'яўляецца непрысваенне яму Нобелеўскай прэміі, бо ніхто з беларускіх пісьменнікаў не заслужыў на яе так як ён. Ніхто таксама так яскрава як Быкаў не дэмаскаваў бальшавізму, сталінізму і адмоўных з'яў у ваенны час, — заявіў старшыня Арганізацыйнага камітэта алімпіяды, шматгадовы кіраўнік Кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта прафесар Аляксандр Баршчэўскі і дадаў, што адметнасць шаснаццатага выпуску алімпіяды заключаецца менавіта ў незвычайнасці галоўнага яе героя. У час цэнтральных элімінацый беларускай алімпіяды, што 4 сакавіка праходзілі ў Бельскім белліцэі, аказалася, што ўсе тэмы да пісьмовых работ тычацца творчасці Васіля Быкава, чаму рады былі нашы ліцэісты. Першая з прапаноў да пісьмовых прац адклікалася непасрэдна да сучасных падзей у Беларусі — „Васіль Быкаў — дэмаскатар бальшавізму ды змагар за дэмакратычную і незалежную Беларусь".

— Я пісала сваю работу на першую тэму, але рада, што ўсе прапановы да сачыненняў тычацца якраз творчасці вялікага пісьменніка Васіля Быкава, які быў таксама вядомым змагаром за дэмакратычную Беларусь. Уся яго творчасць вельмі цікавая і падрыхтоўка да алімпіяды была добрай нагодай, каб шырэй з ёю пазнаёміцца. Аднак у нас было мала часу, каб прачытаць больш твораў Быкава, — сказала Ганна Пякарская з III Агульнаадукацыйнага ліцэя ў Беластоку. — Шкада толькі, што Васіль Быкаў быў вымушаны пакінуць радзіму і жыць дысідэнтам на чужыне.

З Бельскага белліцэя да цэнтральных элімінацый прыступілі 14 вучняў, а з Гайнаўскага белліцэя — 13, што складае невялікі адсотак ад усёй колькасці вучняў у гэтых школах. У Беластоку іншыя ўмовы навучання і зараз на заняткі беларускай мовы ў звышгімназічным узросце ходзіць там толькі 10 ліцэістаў. З іх ліку 7 вучняў прыступіла да раённых элімінацый, а на цэнтральныя спаборніцтвы дабралася 6 асоб (5 вучняў з III Ліцэя і 1 асоба з IV Ліцэя).

— Канцэнтрацыя ўсіх тэм да пісьмовых прац на адну асобу вынікае перш за ўсё з выключнасці Быкава ў беларускай літаратуры. Апошнім часам міністр адукацыі прапанавала таксама, каб у час алімпіяд не было адвольных тэм да пісьмовых работ, што мы і зрабілі на цэнтральных элімінацыях, — тлумачыў прафесар Аляксандр Баршчэўскі.

Ліцэісты пісалі сачыненні паводле розных тэм, але я не спаткаў асоб, якія выбралі б прапанову «Рамантычныя схільнасці ў праблематыцы і стылістыцы „Альпійскай балады"».

Ганна Пякарская з Беластока расказвала пра літаратуру XIX стагоддзя (справа прафесар Аляксандр Баршчэўскі)

— Не было ніякай нечаканасці ў тэмах да сачыненняў, бо нашы вучні рыхтаваліся ўсебакова па творчасці Быкава. На ўроках беларускай мовы мы аналізуем абавязкова аповесць „Аблава", да выбару апавяданні, нейкую іншую аповесць і ліцэісты пішуць сачыненні па творчасці Васіля Быкава. Рыхтуючыся да алімпіяды, мы з вучнямі аналізавалі таксама іншыя яго творы, — тлумачыў настаўнік беларускай мовы Гайнаўскага белліцэя Ян Карчэўскі.

Многія ліцэісты выбралі чацвёртую тэму: «Пачварны характар сталінізму ў аповесці „Аблава"». Вельмі крытычна ацанілі яны сталінскую эпоху на беларускіх землях. Ліцэістам падабаецца творчасць Васіля Быкава з-за яе псіхалагічнага падыходу да многіх жыццёвых пытанняў, што вырашаліся на фоне розных ваенных і іншых экстрэмальных абставін.

— Я рашылася пісаць пра вайну ў творчасці Васіля Быкава, бо ваенныя творы мяне зацікавілі, — заявіла Дар'я Маркевіч.

Ваеннай творчасцю зацікавілася таксама Паўліна Найман з Бельскага белліцэя і іншыя вучні, што пісалі работы па тэме «Цывільнае савецкае насельніцтва ў адносінах да акупанта на прыкладзе „Знаку бяды"».

Побач сачыненняў вучням трэба было таксама выканаць кароткі тэст па граматыцы і зрабіць пераклад тэксту з польскай мовы на беларускую, з чым большасць вучняў справілася паспяхова. Новым і адметным у час цэнтральных элімінацый быў зусім іншы, чым у мінулых гадах і на сёлетніх раённых элімінацыях, падбор тэм да вусных адказаў. Раней вучні рыхтаваліся па ўсёй беларускай літаратуры і на адвольныя тэмы, а адказвалі толькі на адно пытанне, што было на выцягнутым імі білеце. Перад цэнтральнымі спаборніцтвамі былі дасланы ў школы тэмы да вусных адказаў, што таксама тычыліся розных перыядаў у гісторыі беларускай літаратуры, а ўдзельнікі алімпіяды выбіралі з іх па тры тэмы, па якіх рыхтаваліся, прычым тэмы ў вучняў з адной школы маглі паўтарацца. З гэтых трох тэм ліцэісты выбіралі па адной і выступалі па ёй перад камісіямі. Па дзвюх іншых выбраных тэмах члены камісіі ставілі свае пытанні і трэба было адказаць на іх. Калі вучні выбралі тэмы, якія ахоплівалі вялікія партыі матэрыялу, маглі апасацца, што не будуць ведаць адказу на пастаўленае пытанне. Аднак аказалася, што пытанні ад членаў камісіі наогул не былі складанымі і таму мае суразмоўцы былі задаволены новым спосабам вусных адказаў.

— Я лічу, што лепш расказваць па адной з выбраных тэм і пасля адказваць на пытанні па дзвюх іншых, чым расказваць па выцягнутай тэме, бо можна да іх грунтоўна падрыхтавацца. Раней была латарэя і адным вучням трапляліся лёгкія тэмы да расказаў, а іншым — цяжкія, — гаварыў Давід Карчэўскі з Гайнаўскага белліцэя. — Аднак на цэнтральныя элімінацыі прыязджаюць ужо самыя лепшыя вучні і таму нялёгка стаць лаўрэатам.

— Калі я рашыўся расказваць пра літаратуру перыяду Кіеўскай Русі, стараўся звярнуць увагу на розныя цікавыя справы з гэтага перыяду і мог бы многа часу расказваць, калі б мяне не спынілі. Цяжка зараз прадбачыць якая тэма трапілася б у выпадку старой формулы вусных адказаў і таму лепш расказваць па-новаму, — сказаў Пётр Давідзюк, таксама з Гайнаўкі.

Новыя формулы падборкі тэм да пісьмовых работ і вусных адказаў даюць вучням магчымасць канцэнтравацца ў час падрыхтоўкі да алімпіяды на меншых партыях матэрыялу па гісторыі беларускай літаратуры, у параўнанні з тым, што было ў мінулым. Хаця змены выдатна аблягчаюць падрыхтоўку да алімпіяды, павінны быць у карысць самым лепшым вучням, бо абмяжоўваюць выпадковасць. Час пакажа, як яны спрацуюць у час чарговых выпускаў, а ў наступным годзе героем беларускай алімпіяды мае быць Уладзімір Караткевіч.

Пасля праверкі сачыненняў і граматычнага тэста аказалася, што лаўрэатамі алімпіяды сталі 6 асоб. Першае месца заняла **Паўліна Найман** з Бельскага белліцэя, на другім месцы апынулася **Марта Адамюк** з Гайнаўскага белліцэя, а трэцяе месца заняў **Адам Голуб** з Бельскага белліцэя. Чацвёртыя раўнапраўныя месцы занялі **Аляксандра Ігнацюк** з Бельскага белліцэя, **Дар'я Маркевіч** з Гайнаўскага белліцэя і **Ганна Пякарская** з III Агульнаадукацыйнага ліцэя ў Беластоку. Усе іншыя ўдзельнікі цэнтральных элімінацый сталі фіналістамі алімпіяды.

„Год беларускі-2010” ад Сакрата Яновіча

Сяргей ЧЫГРЫН

Наш пісьменнік і філосаф Сакрат Яновіч даслаў з Крынак з Villy Sokratesa чарговае (адзіннацатае па ліку) выданне „Annus Albaruthenicus-2010”. Знаёмства з ім я пачаў з артыкула дырэктара Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ) Ганны Запартыкі, які гучыць так: „Асабісты архіў Сакрата Яновіча і яго роля ў ацэнках літаратурна-грамадскага жыцця Беласточчыны”. У ім спадарыня Ганна паведамляе, што архіў Сакрата Яновіча — гэта пакуль што адзіны архіўны фонд у БДАМЛМ прадстаўніка магутнай плеяды беларускіх дзеячаў Польшчы другой паловы XX — пачатку XXI стагоддзяў. Гэта адзін з багацейшых архіўных збораў у Беларусі, які змяшчае амаль 9 тысяч дакументаў аб літаратурна-грамадскім жыцці Польшчы і Беларусі, а разам з тым і Еўропы, адлюстроўвае важныя ўзаемадачыненні яго яркіх прадстаўнікоў з дзеячамі многіх краін свету.

Аказваецца, першыя паступленні ў Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва дакументаў Сакрата Яновіча адбыліся ажно ў 1981 годзе. Далей былі паступленні ў 1987, 1989, 1990, 1991, 1993 гадах. У 1995 годзе архіўны фонд пісьменніка прайшоў навуковую апрацоўку, што дало магчымасць сфарміраваць 493 справы, якія ахапілі перыяд з 1944 да 1994 гадоў і змясцілі 3276 дакументаў. Як навуковая архіўная сістэма гэтая частка фонду мае сёння сем раздзелаў: 1. Рукапісы аўтара. 2. Пераклады твораў Сакрата Яновіча. 3. Перапіска. 4. Біяграфічныя матэрыялы. 5. Матэрыялы пра пісьменніка. 6. Матэрыялы, сабраныя Сакратам Яновічам. 7. Выяўленчыя матэрыялы. У кожным з гэтых раздзелаў, як паведамляе Ганна Запартыка, ёсць свая інфармацыя, што асвятляе жыццё і дзейнасць фондаўтваральніка, паказвае як кола інтарэсаў, так і службовыя, сваяцкія, сяброўскія сувязі.

Апошняе і самае вялікае паступленне дакументаў Сакрата Яновіча ў БДАМЛМ адбылося ў ліпені 2007 года ў дні правядзення „Беларускага Трыялога”. Дастаўку гэтай часткі архіва С. Яновіча ў Беларусь ажыццявілі супрацоўнікі Генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку. Прачытаўшы гэты артыкул, адразу ўзнікае пытанне: а хто наступны са старэйшых беларускіх літаратараў Польшчы перадасць свой архіў на Беларусь?..

Значнае месца ў „Годзе беларускім-2010” займаюць вершы Дзмітры Шатыловіча на дзвюх мовах — польскай і беларускай. Гэта вершы, прысвечаныя роднай мове, гісторыі Беларусі і яе асобам.

Віталь Воранаў у сваім перакладзе знаёміць беларускамоўных чытачоў выдання з новымі творамі ірландскага літаратара, лаўрэата Нобелеўскай прэміі Сэмюэла Бэкета. Дарэчы, і летась у гадавіку „Annus Albaruthenicus” друкаваліся яго творы ў перакладзе таго ж Віталя Воранава.

У 90-х гадах XX стагоддзя разам з хваляй эміграцыі тысячы беларусаў апынуліся ў Нямеччыне. У аднаго з іх, пісьменніка і журналіста Аляксандра Тарановіча, глыбока інтэграванага ў нямецкае грамадства, з'явілася жаданне даць параўнальны аналіз двух народаў — нямецкага і беларускага. Як піша аўтар, у адрозненне ад французаў ці фінаў, вонкава беларусы і немцы падобныя на 99%. Тым не менш, гэта два розныя народы. Таму ў сваім эсэ аўтар, на падставе фактаў і вывадаў спецыялістаў, аб'ектыўных і суб'ектыўных назіранняў і параўнанняў, адказвае на пытанні: чаму немцы не п'юць, а выпіваюць і не лаюцца матам? Чаму тыповы беларус жыве ў штучна створаным ім у сваім уяўленні ідэальным свеце, а немец гэты свет будуе ўласнымі рукамі? Чаму філасофія беларуса — гэта вера ў наканаванасць, а філасофія немца — вера ў свае магчымасці і сілы?.. І, сапраўды, чаму?..

Артыкул Віталя Карнелюка „Destination Belarus” прысвечаны пытанням развіцця турызму ў Беларусі. Але сярод рознага кшталту пытанняў, якія нараджае сённяшняе развіццё турысцкага прадпрымальніцтва ў Беларусі, ёсць адно выключэнне: месца і роля беларускай мовы ў турыстычнай індустрыі краіны. Як разважае аўтар, ужо цяпер бачна тэндэнцыя: тых, хто наведвае нашу краіну (а сярод іх большасць з Расіі) хочуць бачыць беларускі народ адметны, са сваім, у тым ліку моўным каларытам. Нельга рабіць, каб ва ўмовах рынкавай кан'юнктуры нацыянальная мова была чарговы раз выціснута з ужытку, бо доўгатэрміновае, стратэгічнае планаванне турыстычнай паспяховасці напрасткі звязана з актыўнай, паўсюднай роллю беларускай мовы ў турбізнесе. Турызм — не навіна для Беларусі. Таму трэба прыкласці ўсе намаганні, каб ён сфарміраваўся сапраўды беларускім, а значыць адметным, арыгінальным, прывабным і канкурэнтаздольным.

Зміцер Вішнёў у сваім артыкуле „Aktuelle literarische Entwicklungstendenzen in Belarus” суб'ектыўна ацэньвае сённяшні літаратурны працэс на Беларусі, падкрэсліваючы пры гэтым, што ў апошнія дзесяць гадоў узрасла цікавасць еўрапейцаў да сучаснай беларускай літаратуры. Тым не менш, аўтар даволі скептычна выказвае сваё меркаванне наконт перыядычных літаратурных выданняў, паказваючы іх недахопы і пралікі.

Анджэй Пісказуб у „Годзе беларускім-2010” разважае пра Буг, а канкрэтней пра мёртвы рэгіён пабапал берагоў Буга. Як гэта сталася, піша аўтар, што Буг з вялікай рэчкі зрабіўся памежным ручайком між дзяржавамі. Будучыня рэгіёна Буга залежыць цяпер ад паразумення трох дзяржаў — Польшчы, Беларусі і Украіны. Ад таго, наколькі яны якраз убачаць карысць сабе ў аднаўленні адвечнага бугскага шляху „ад мора да мора”, г.зн. ад

Балтыкі да чарнаморскіх партоў.

Прафесар з Гродна Вячаслаў Швед вяртае чытачоў да першай чвэрці XIX стагоддзя — філаматаў, філарэтаў, прамяністых, Таварыства Шасці, Навуковага і Маральнага таварыстваў, Заранаў, Згодных братоў. Гісторык мяркуе, што ліцвіны, якія складалі большасць складу патаемных таварыстваў, паходзілі з мясцовага насельніцтва, таму яны з'яўляюцца гістарычнай спадчынай грамадзян Беларусі, яе нацыянальнымі героямі.

Доктар гуманітарных навук Юры Вашкевіч вырашыў падзяліцца сваімі суб'ектыўнымі думкамі наконт беларусаў, хаця з гэтымі думкамі можна пагадзіцца. Ён піша, што беларусы — гэта ўнікальнае ў Еўропе насельніцтва без пачуцця бацькаўшчыны, як і перспектывы на будучыню, якая немагчымая без нацыянальнасці. „Менталітэт жыхароў Беларусі, — піша аўтар, — знаходзіцца на ўзроўні мужыцка-калгаснага існавання без сур'ёзных імкненняў у бок цывілізаванага развіцця. Зрухі дзеля еўрапеізацыі адбудуцца не раней, чым у пакаленні сённяшніх унукаў. Пры ўмове, што не выраздзіцца ўшчэнт цяперашняя папуляцыя. Рэспубліцы Беларусь пагражае апустыненасць, засмоктванне ўплывам еўрапейскіх арэалаў росквіту, перш за ўсё Нямеччыны, а таксама Польшчы і Чэхіі”.

Адкрываецца штогоднік маральна-філасофскім эсэ Ігната Канчэўскага-Абдзіраловіча „Адвечным шляхам”, якое ён напісаў і выдаў ажно ў 1921 годзе ў Вільні. У выданні друкуюцца першыя два раздзелы гэтага артыкула ў перакладзе на нямецкую мову. Ігнат Канчэўскі (1896-1923) у „Адвечным шляху” раскрыў драматызм гістарычнага лёсу беларусаў і ў той жа час падкрэсліў іх неадольнае імкненне захаваць незалежнасць, „ісці пароўні з іншымі народамі на будоўлю новага агульначалавечага ідэалу”. Галоўным у адраджэнні Ігнат Канчэўскі лічыў дзяржаўную незалежнасць, разглядаў яе як агульначалавечы ідэал...

Хачу падкрэсліць, што тэматыка артыкулаў у „Годзе беларускім-2010” вельмі разнастайная. Галоўнае, каб кніга ў першую чаргу дайшла да еўрапейскага чытача, каб еўрапейцы з цікавасцю яе прачыталі і зразумелі, што ёсць такая краіна Беларусь са сваёй багатай і няпростай гісторыяй.

Рэчаіснасць

Адыходзяць сяляне няспынна
Старыя, старыя.
Сумуюць па іх труны-хаціны
Пустыя, пустыя.

Нашы родныя бедныя вёскі
Знікаюць, знікаюць.
Дзірваном зарастаюць палоскі
І гаем, і гаем.

Мы чамусьці ад роднае мовы
Нямыя, нямыя.
Ловім заўжды суседнія словы
Чужыя, чужыя.

І мы часта не ведаем: хто мы?
Як дзеці, як дзеці.
І таму мы так мала вядомы
На свеце, на свеце.

Падзяка і просьба

Дзякуй Табе, Божа,
За сонейка прамень,
За кожненькі прыгожы
Пражыты мною дзень.

Так не цаніў ніколі
Ранейшага жыцця,
Пакуль дайсці не здолеў
Да грані небыцця.

І тут я нечакана
Зрабіў жыцця падлік:
Есць яшчэ справы, планы,
Якіх я не пранік.

Таму, мой Божа мілы,
Хачу Цябе прасіць:
Дай мне здароўя, сілы,
Каб мог яшчэ тварыць.

Ці можна і ці варта?

Ці можна жыць бяззубым?
Уставяць нам ласкава,
І будзе глянуць люба,
І будзе ўжо па справе.

Ці можна жыць без сексу?
Дык можна ж, вядома.
Скажу я тут з рэфлексам:
Спачуваць такому.

Ці можна жыць без чаркі?
Дык можна таксама.
Жыццё імчыць так шпарка,
Не кульнеш з сябрамі.

Ці можна жыць без сэрца?
Напэўна немагчыма.
Працуе аж да смерці,
Пакуль мы шчэ жывымі.

Сэрца і іншым, паверце,
Трэ мець, бо скажуць — скупасць,
Жыве ўжо ён без сэрца,
Жывым ужо ён трупам.

Дык могуць быць сумненні
І сцвярджэнні ўпарта:
Як толькі адрачэнняў –
Ці жыць наогул варта?

Праваслаўныя могілкі

У апошнюю праводжу я дарогу
Сваякоў, сяброў сваіх, знаёмых.
Як жа тут памерлых многа, многа...
Што каб маглі сказалі б: „мы ўжо дома”.

Сярод магіл блукаю адзінока,
Тут штораз больш усё мяне цікавіць.
Якая ж спальня сумная навокал!
І мой спачын тут будзе неўзабаве.

Бачу, знікаюць з намагільных плітаў
З нябожчыкамі звязаныя словы,
З кірылічным, нам блізкім алфавітам,
І з нашай роднай беларускай мовай.

Калісь тут прыйдуць нашыя нашчадкі
І на магілах расшыфруюць знакі.
Народзіцца тады такая згадка:
Ляжаць тут праваслаўныя палякі.

Узор служэння сваёй малой айчыне

Канстанціна Майсеню ўспамінае Юры Равінскі — былы намеснік дырэктара Керамічнага завода ў Старым Ляўкове.

У Ляўкова прыехаў я маладым хлопцам 2 студзеня 1970 г. у двухмесячную камандзіроўку, каб дапамагчы свайму калегу пры другім этапе разбудовы Керамічнага завода. Будаўнічыя працы вяло Беластоцкае прадпрыемства прамысловага будаўніцтва з Беластока, якога я быў працаўніком. У 1960-1970-я працавала ў ім 2500 рабочых, якія ўзводзілі найбольшыя фабрыкі і заводы ва ўсходняй Польшчы. Тут, у Ляўкове, знайшоў я сваю другую палавінку і ў 1971 годзе ажаніўся. Пасля завяршэння будовы ў 1973 г. я перайшоў працаваць на Керамічны завод. Спачатку працаваў я зменным майстрам, а пасля кіраўніком цэха.

Канстанціна Майсеню памятаю добра. Прыйшоў ён да нас на працу пад канец 1975 года, а адышоў, мабыць, у 1977 г. Тады Керамічны завод у Старым Ляўкове знаходзіўся ў структуры Беластоцкіх фабрык будаўнічай керамікі. Майсеня стаў кіраўніком ляўкоўскага завода, а я — яго намеснікам. Пасля некалькіх месяцаў яго працы на пасадзе кіраўніка завод атрымаў большую самастойнасць, а ён сам стаў дырэктарам завода. Беластоцкая цэнтраля прызначыла яму службовую машыну — чорную „Волгу", што на гэты час было незвычайным здарэннем. Пасля адыходу Майсені „Волгу" забралі і аж да 1990-х гадоў ніводзін з ляўкоўскіх дырэктараў не меў службовага легкавіка. У той час Беластоцкія фабрыкі будаўнічай керамікі налічвалі 2500 працаўнікоў, а сама дырэкцыя ў Беластоку — каля 150 асоб. Беластоцкая вярхушка паважала Майсеню як спецыяліста, лічылася з яго словам.

Гайнаўка 1991 г. Дэлегацыя Керамічнага завода з Ляўкова перадала партыю цэглы на пабудову Беларускага музея. Злева: Канстанцін Майсеня, Міхал Харкевіч, Міхал Равінскі, NN, Яўген Кардаш, Аляксандр Бандарук, Анатоль Ляшчынскі, Уладзімір Сухадола, Віталь Красноўскі, Пётр Максімюк, Ян Лешчук, Яўген Грыц.

Калі Майсеня ўступіў на пасаду кіраўніка Керамічнага завода ў Старым Ляўкове, налічваў ён 385 працаўнікоў — найбольш ва ўсёй гісторыі прадпрыемства. Працавалі мы ў чатырохбрыгаднай сістэме на тры змены цэлы год. Сярэдні ўзрост працоўнага калектыву складаў тады 23 гады, маладое было таксама кіраўніцтва завода. Дырэктар Майсеня паспяхова спраўляўся са сваімі абавязкамі, узорна арганізаваў работу і прадукцыю, паколькі ў яго быў вопыт працы на кіраўнічых пасадах. Ён быў спецыялістам-упраўленцам, а тэхналагічнымі працэсамі займаліся інжынерна-тэхнічныя кадры. Канстанцін Майсеня быў адным з тых першых, хто ўнёс вялікі ўклад у інтэграцыю працоўнага калектыву і кіраўнічых кадраў. Хачу адзначыць, што ён пераарганізаваў бухгалтэрыю, прыцягваў на працу найлепшых спецыялістаў. Напрыклад, да сённяшняга дня паспяхова спраўляецца наш галоўны механік.

Майсеня быў справядлівым, сумленным чалавекам, усіх трактаваў аднолькава, не павышаў голасу на сваіх працаўнікоў, з вялікай павагай, спакоем разважаў усе працоўныя справы, без непатрэбных канфліктаў.

Адыходзячы з Імшару ў Ляўкова, Майсеня аформіў перавядзенне ў рэсурсы Керамічнага завода рыбных ставаў у Тарнопалі. Служылі яны для інтэграцыйных сустрэч працоўнага калектыву. У вольны ад работы час забіраў ён на завадскім мікраўтобусе „Ныса" працаўнікоў над ставы, дзе пры вогнішчы і смажанай рыбе замацоўваліся міжлюдскія адносіны. У такі спосаб ён яднаў нас, што мела станоўчы ўплыў на працу завода. Дырэктар Майсеня дбаў пра сацыяльныя ўмовы. Дзякуючы яму ГС у Нараўцы адкрыў на тэрыторыі завода невялікі прадуктовы магазін, сарганізаваў міні-бар, у якім можна было паабедаць, выпіць каву ці гарбату. Для малой гастраноміі закупіў ён неабходнае абсталяванне, якое перадаў нараўчанскаму ГСу.

Канстанціну Майсеню дарагімі былі таксама справы культуры. Гэта па яго ініцыятыве паўстаў фальклорны хор, якім стаў кіраваць Аляксандр Лукашук. У ліку першых харыстаў быў і я, а таксама цяперашні кіраўнік завода Аляксандр Бандарук. У хоры мужчын і жанчын было па палове. Назву „Цаглінкі" хор атрымаў ужо пасля адыходу Майсені з Ляўкова. Бацькам хросным хору стаў тагачасны дырэктар Аляксандр Бандарук.

Калі Канстацін Майсеня будаваў Беларускі музей у Гайнаўцы, наш завод успамагаў яго будаўнічымі матэрыяламі. Пры кожнай сустрэчы абводзіў ён нас па будове, цешыўся зробленым, расказваў пра будучае. Ад аднаго з такіх спатканняў застаўся здымак.

Тыя, што працавалі з Канстанцінам Майсенем успамінаюць яго з вялікай пашанай. Для мяне асабіста быў ён прыкладам і ўзорам у кіраванні працоўным калектывам. Запомніліся мне яго словы, выказаныя на адной з вытворчых нарад: „Помніце, што добры кіраўнік гэта такі, з-пад крылляў якога працаўнікі не трапляюць за краты". Гэтыя словы спадарожнічалі мне за ўсе сорак гадоў працоўнага стажу на кіраўнічых пасадах. Мінулі амаль 4 гады як пайшоў з жыцця Канстанцін Майсеня. Аднак памяць пра яго захоўваецца ў сэрцах тых, хто яго ведаў.

Запісаў Віктар БУРА

Звяртанне да этнічнай музыкі характэрнае для сённяшняй беларускай моладзі, якая атаясамляе сябе беларускім народам, лучыцца з яго гісторыяй, культурай, мовай. Пра некаторыя з „этнічных" гуртоў, напрыклад, такіх як „Стары Ольса", ужо распавядалася на старонках „Нівы". Цяперашні расповед будзе тычыцца гурту „Ветах", які называе сябе гуртом крыўскае музыкі.

Паколькі амаль кожнае аб'яднанне па інтарэсах у наш час мае старонку ў інтэрнэце, „Ветах" у гэтым сэнсе не ёсць выключэннем. Ягоны сайт месціцца па адрасе **http://vietah.narod.ru.**

Галоўная старонка сайта гурту не звычайная — яна прадстаўлена выяўленнем чорнага неба з зоркамі, якія зіхацяць. Пад назвай гурту, якая падзеленая дзіўнай маскай, месцяцца выйсці да трох моўных версій сайта. Прычым пададзены яны таксама даволі дзіўна — англійская і французская пазначаны на адпаведных мовах, а беларуская ўказана проста як „мова". Што хацелі сказаць такой падачай уладальнікі сайта не зусім зразумела, магчыма, што „мова" ёсць толькі адна — беларуская.

Калі „клікнуць" на „мову", то мы апынемся на старонцы сайта, што носіць назву „Навіны". Варта адзначыць, што напрыканцы мінулага года гэтая старонка абнаўлялася даволі часта. На даным этапе — зацішша. Верагодна, пакуль у жыцці гурту не адбывалася больш-менш значных падзей, вартых расповеду на сайце. Калі ж меркаваць па ранейшых паведамленнях, то разнастайных творчых вандровак і выступленняў у жыцці музычнага калектыву летась было дастаткова. Гэта і канцэрты ў Заходняй Еўропе, Санкт-Пецярбургу, удзел у шматлікіх мерапрыемствах, арганізаваных Універсітэтам культуры і мастацтваў.

Каб бліжэй пазнаёміцца з „Ветахам", нельга абмінуць старонку „Гісторыя". „«Ветах» — паўночна-беларуская назва Месяца ў трэцяй квадры, — распавядаюць пра дзіўную назву гурту яго ўдзельнікі. — Калектыў «Ветах» («VIETAH») створаны ў 1997 годзе ў Мінску Вячаславам Калацэм з прафесійных музыкаў як гурт дударскай музыкі. Мэта яго стварэння — рэстаўрацыя ўніверсальных «матрыц» асноўных партытур каранёвага меласу беларусаў".

Зноў жа не зусім зразумела, навошта пры самапрэзентацыі ўжываць далёка не кожнаму зразумелыя словы, але гэта, пэўна, ёсць своеасаблівым жаданне неяк выдзеліцца і, магчыма, тым самым запомніцца наведвальнікам сайта. Што ж тычыцца паняцця „мелас", то гэта слова, якое выкарыстоўвалася ў Старажытнай Грэцыі для абазначэння напеву, мелодыі альбо прызначанага для спеваў лірычнага верша.

На гэтай жа старонцы месціцца падрабязны расповед пра дзейнасць гурту да сённяшніх дзён і даецца пералік запісаных кампактных дыскаў. А калі цікаўны карыстальнік захоча спампаваць песні і музыку з іх, то яму варта зайсці ў наступную рубрыку — „Плыты".

Далей па чарзе ідзе старонка „Фота". Яна змяшчае вялікую колькасць фотаздымкаў з разнастайных імпрэз, у якіх удзельнічаў гурт. Знаёмства з фотагісторыяй „Ветаха" і праслухоўванне ягонай музыкі дае магчымасць больш дакладна ўявіць, што прадстаўляе з сябе гурт, нават калі вы ніколі не прысутнічалі на яго выступленнях.

Падзяліцца сваімі ўражаннямі можна ўжо на наступнай старонцы, якая носіць назву „Гасцёўня".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Сямейны падрад

На 13-ым чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы ў залах, што прайшоў у сталіцы Катара — горадзе Доха, Беларусь была прадстаўлена невялікай камандай з 9 чалавек: чатыры штурхальнікі ядра, два бегуны на дыстанцыі з бар'ерамі, а таксама мнагаборац, прадстаўніца скачкоў у даўжыню і бягуння на сярэднюю дыстанцыю. А між тым першынство, якое толькі другі раз у гісторыі праводзілася ў Азіі, было досыць прадстаўнічым — у Катар з'ехаліся 650 атлетаў ажно з 149 краін (апошняя лічба — рэкорд). Зрэшты, малое прадстаўніцтва Беларусі на форуме было на гэты раз цалкам абгрунтаваным — выступілі толькі тыя, хто прэтэндаваў на медалі і тыя, хто заслужыў удзел сваімі папярэднімі вынікамі.

Пазітыўныя чаканні спраўдзіў адзін з найбольш тытулаваных айчынных лёгкаатлетаў Андрэй Міхневіч. З вынікам 21,68 м ён заваяваў сярэбраны медаль у штурханні ядра. Іншы наш прадстаўнік у гэтым відзе Павел Лыжын заняў 6-е месца — у лепшай спробе ён паказаў 20,67 м. Тым самым і яму дасталася частка грашовага „пірага". Агульныя прызавыя на гэтых спаборніцтвах складалі 2,5 мільёна долараў, а ўзнагароджваліся ўсе, хто займаў пазіцыі з першай па шостую. Прычым прызёры атрымалі адпаведна па 40, 20 і 10 тысяч адпаведна. Чэмпіёнскі тытул у „жалезных гульнях" здабыў вядомы амерыканскі атлет Крысціян Кантвел — 21,83 м. Цікава, што ўсе згаданыя асілкі апынуліся на месцах паводле папярэдняга рэйтынгу.

Штурханне ядра — фірменная адзнака айчыннай лёгкай атлетыкі. Найбольшага поспеху на гэты раз дасягнула Надзея Астапчук, штуршок якой на 20,85 м прынёс ёй залаты медаль. Пачын свайго мужа падтрымала Наталля Міхневіч, якая за вынік 20,42 м (лепшы для яе ў сезоне) атрымала бронзавую ўзнагароду. Такі вось сямейны падрад і істотнае папаўненне свайго бюджэту.

У спаборы сяміборцаў Андрэй Краўчанка, які ўжо неаднаразова дамагаўся высокіх месцаў на топ-турнірах, на гэты раз сярод універсалаў лёгкай атлетыкі стаў чацвёртым, набраўшы 6124 ачкі. Нешта падказвае, што да класічнага чэмпіянату свету ў поўным фармаце Краўчанка набярэ сваю лепшую форму і прадэманструе большае. А на гэты раз перамог колішні алімпійскі чэмпіён Браян Клэй з ЗША — ягоная сума 6204 балаў. Дадам, што на гэты раз выступалі толькі 8 майстроў, але ўсе зоркі першай велічыні.

Вераніка Шуткова, шматразовая чэмпіёнка краіны, у скачках у даўжыню з вынікам 6,43 м заняла 9-е месца і, на жаль, у актэт фіналістак не трапіла. Магчыма, крыху забракла досведу. А яшчэ адна дэбютантка спаборніцтваў такога рангу бягуння Аліна Талай з паказчыкам 8,18 сек. у паўфінале таксама не здолела прабіцца ў вырашальны забег на дыстанцыі 60 метраў з бар'ерамі. У той жа бегавой спецыялізацыі такі ж выхад напаткаў Максіма Лыншу — вынік 7,71 сек. не дазволіў яму трапіць у лік фіналістаў. Забег на дыстанцыі 1500 метраў сярод жанчын прынёс Наталлі Карэйве 10-е месца. Перамагла ў гэтым відзе Калкідан Гезахегне з Эфіопіі, якая і была галоўнай фаварыткай. У прынцыпе ўсе пералічаныя ў гэтым абзацы нашы атлеты вышэй галавы не скокнулі, але заданне-мінімум выканалі, выступіўшы на сваім роўні.

Тры медалі дружыны пад кіраўніцтвам Анатоля Бадуева — досыць аптымістычны пралог у лёгкаатлетычны сезон. Аднак „каралева спорту" заўсёды здольная на сюрпрызы, прычым як аб'ектыўнага, так і суб'ектыўнага (праблема з тым жа допінгам) характару. Пакуль жа канстатуем пэўнае абнаўленне зборнай і пацвярджэнне лідарамі каманды свайго статусу.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Як пячы хлеб

Я заўсёды стараюся, каб у кожную нядзелю ў 7.55 раніцы паглядзець у тэлебачанні перадачу „Беларускі тыдзень". І вось 28 лютага, калі я пачуў, што будуць у тэлевізары вучыць як выпякаць вясковы хлеб у Гміннай бібліятэцы ў Нарве, стаў я гэтаму з увагай прыглядацца. Нават мая жонка прысела, каб паглядзець, бо мая Соня выпякала калісьці вельмі добры хлеб. Тут мушу дадаць, што дырэктарка Гміннай бібліятэкі Анна Андраюк-Савіцкая вельмі добра дбае аб бібліятэку — яе інтэр'ер і ваколіцу будынка, арганізуе розныя курсы і мерапрыемствы, а калі туды зойдзеш, заўсёды знойдзе час на гутарку. Таму так прыемна зайсці ў нарваўскую бібліятэку. Але тут хачу сказаць пра інструктарку, якая вучыла жанчын як выпякаць хлеб. На маю думку, калі б вясковая гаспадыня выпякала хлеб па яе рэцэпце, дык варта было б яе пагладзіць за гэта, як у нас гаворацъ, крутой бярозкай па пазурах. Па вёсках кухняй пераважна займаюцца жанчыны, а ўсім вядома, што ніякай стравы не падрыхтуеш без прымянення ўласных рук. Інструктарка пры вучэнні выпечкі хлеба гаварыла пра прадукты неабходныя для яе, але баялася ў рошчыну ўсадзіць свае памаляваныя пазногці. Можа, пабаялася, што ў рошчыне застанецца фарба з кіпцяў?.. А калі ўжо накладвала цеста ў бляхі, дык гэта рабіла драўлянай лапаткай. Тады я падумаў, што мо ў яе пазногці штучныя і маглі б адклеіцца і застацца ў цесце. Ці ж такім чынам такая ненатуральная гаспадыня будзе вучыць вясковых баб выпякаць вясковы хлеб?..

Па вёсках жыве яшчэ шмат жанчын, якія ўмеюць пячы хлеб. Яны ў большасці цяпер пенсіянеркі. Мая нявестка яшчэ і цяпер пячэ смачны хлеб, а сын вязе жыта, каб змалоць яго на муку ў Орлю, бо бліжэйшыя ад нас млыны ўсе пазачынялі.

А што датычыць хлеба, дык да яго патрэбны добрая закваска, вада, соль, мука ды дрожджы для пухкасці, некаторыя жанчыны дадавалі ў рошчыну яшчэ кіслае малако, каб хлеб быў бялейшы, ды вараную бульбу, каб даўжэй трымаў свежасць. Ну, і патрэбна была адпаведная тэмпература для рошчыны і замесі цеста, і для таго, каб у бляхах адпаведна падрос, пакуль яго ўставіць у печ, каб не было закальцу. Калі гэтага інструктар не ведае, дык няхай прыедзе ў любую вёску, тады мо нашы жанчыны яе навучаць як пячы добры вясковы хлеб!

НАШЫ КАРЭСПАНДЭНТЫ

Супраць нецвярозых шафёраў

(ус)

8-9 сакавіка г.г. Гайнаўская дарожная паліцыя арганізавала акцыю супраць нецвярозых шафёраў. За два дні паліцэйскія праверылі 229 шафёраў, прычым чатырох з іх не змагло паехаць у далейшую дарогу. Рэкордсменкай аказалася 63-гадовая жыхарка Гайнаўкі. У час праверкі спіртамерам 8 сакавіка (Дзень жанчын) паліцэйскія выявілі ў яе арганізме каля двух праміляў алкаголю. Наступнага дня, г.зн. 9 сакавіка, кантроль праводзіўся пад лозунгам „Цвярозы ранак" і пачаўся ў вёсцы Дубіны. На працягу амаль дзвюх гадзін паліцэйскія праверылі 170 шафёраў. У іх ліку апынуўся адзін вадзіцель, які рызыкнуў сесці за руль пасля кілішка. Быў гэта 38-гадовы шафёр грузавога аўтамабіля маркі „Kia", які падаваўся на працу. У яго было выяўлена 0,8 праміля алкаголю. Функцыянеры аўтаінспекцыі гаворацъ, што цяпер менш шафёраў сядае за руль пасля выпіўкі. Чатырох парушальнікаў закону, выяўленых у час гайнаўскай акцыі, не толькі страцілі вадзіцельскія правы, але будуць прыцягнуты да судовай адказнасці.

Спадзяванні чарамшан...

Уладзімір СІДАРУК

Калі ўступіць у сілу закон аб малым памежным руху паміж Польшчай і Беларуссю пакуль цяжка сказаць. Аптымістычны прагноз прадвяшчае, што мабыць напрыканцы гэтага года. Такія высновы можна зрабіць пасля падпісання 12 лютага ў Варшаве паміж кіраўнікамі МЗС абедзвюх краін дамовы. Мяне, як і многіх чарамшан, гэтая справа моцна цікавіць. Неаднойчы знаёмыя ставілі пытанне: на аснове якіх дакументаў можна будзе паехаць за ўсходнюю мяжу і якім коштам абыдзецца здзелка? З дасягнутых дамоўленасцей вынікае, што перасяканне мяжы будзе адбывацца на аснове карты з двухгадовым тэрмінам сапраўднасці, якая будзе каштаваць 20 еўра. На пытанне, ці знойдуцца ахвотныя купіць такую карту, кожны з суразмоўцаў даваў мне станоўчы адказ. Варта прыкмеціць, што жыхары прыгранічнай паласы маюць суродзічаў у Беларусі і праяўляюць жаданне падтрымліваць непасрэдныя сямейныя кантакты. Калісьці была магчымасць пераходзіць мяжу пешшу. За такой формай турыстычнага абменну (пешаходнага і веласіпеднага) выказваюцца многія грамадзяне і зараз, бо не кожны карыстаецца аўтамабільным транспартам.

Практыка паказала, што пасля ўваходу ў Шэнгэнскую зону візавы рэжым абвастрыўся. Замаруджанне трансгранічнага абмену прыкмеціў я на пагранпераходзе у Полаўцах. Гаварылі пра тое таксама функцыянеры Чаромхаўскай заставы Памежнай аховы. З іскрынкай надзеі чакаем затым пачатку разбудовы гэтага пагранперахода, паколькі дае ён шанц для Чаромхі ў сферы не толькі культурных, але і гаспадарчых кантактаў. Калі верыць абяцанкам „вярхушкі", гэта будзе суперсучасны міжнародны пагранпераход, кошт мадэрнізацыі якога складзе больш за 140 мільёнаў злотых (войт мяркуе, што кошты панізяцца). Яшчэ ў канцы гэтага года будзе аб'яўлены аўкцыён па вылучэнні выканаўца інвестыцыі. У мінулым годзе закончылася высечка дрэў на прыдарожнай паласе. Можна меркаваць, што затым пачнуцца іншыя працы.

Апрача разбудовы пагранічнага перахода ў Полаўцах гаворка ідзе аб мадэрнізацыі чыгуначных пунктаў у Чаромсе і Семяноўцы. Тычыцца гэта перш за ўсё таварнага руху ў сувязі з інвестыцыяй Ікэі, а гэтым самым і імпартам драўніны з-за ўсходняй мяжы. Але для гэтай мэты патрабуецца арганізацыя фітасанітарных служб у Семяноўцы. З таго, што вядома, справа пакуль што знаходзіцца ў мёртвым пункце. Мо з надыходам вясны адказныя ўстановы прабудзяцца з дрыматы і зварухнуць справу з месца? ...

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — страфу з Аляксея Пысіна.

1. зрушэнне касцей у суставе = 29 _ 30 _ 19 _ 20 _ 31 _;
2. асобны квартал горада выдзелены для пражывання дыскрымінаванага насельніцтва = 48 _ 39 _ 21 _ 22 _;
3. частка драматычнага твора = 88 _ 89 _ 85 _ 90 _;
4. ручны млын з двух круглых камянёў = 91 _ 92 _ 40 _ 10 _ 8 _;
5. горад у Цюрынгіі з заводам Карла Цэйса = 54 _ 64 _ 68 _ 66 _;
6. самая новая эра ў геалагічнай гісторыі Зямлі = 74 _ 75 _ 73 _ 43 _ 44 _ 84 _ 72 _ 93 _;
7. куча сухога галля = 76 _ 17 _ 70 _ 16 _;
8. фігура ў выглядзе чалавечага тулава для паказу адзення = 8 _ 2 _ 12 _ 11 _ 79 _ 13 _ 63 _;
9. вадкасць з нырак = 45 _ 49 _ 14 _ 80 _;
10. прозвішча аўтара „Палескай хронікі" = 24 _ 23 _ 52 _ 53 _ 71 _;
11. частка сушы, якая вострым вуглом выходзіць у мора = 59 _ 26 _ 27 _;
12. бацька Хама = 46 _ 47 _ 18 _;
13. вялікая сібірская рака = 51 _ 50 _;
14. з яе слова не выкінеш = 32 _ 33 _ 35 _ 34 _ 62 _;
15. балгарскія горы ў... аспірыне = 60 _ 61 _ 65 _ 77 _ 38 _;
16. Анатоль, беларускі паэт з Гарошкава = 81 _ 82 _ 78 _;
17. вялікая драпежная змяя трапічных краін = 15 _ 83 _ 41 _ 42 _;
18. галіна хіміка = 56 _ 55 _ 25 _ 36 _ 37 _;
19. наглядчык за працай прыгонных сялян = 7 _ 6 _ 3 _ 4 _ 1 _;
20. „тонкая" паўднёваамерыканская дзяржава = 57 _ 58 _ 5 _ 28 _;
21. маскоўская рака = 69 _ 67 _ 86 _ 87 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 7 нумара

Банда, боль, вата, вецер, дах, дзядзіна, кіёск, Кітай, Ліда, мача, прашча, пушча, скіт, столь, сцяг, сцяна, сышчык, цана, цар, цівун, цяля, шах, Эбра.

Рашэнне: **Птушцы да шчасця — вольнасці трэба, да шчасця краскі — яснага неба, дзіця шчасліва — на руках маткі, бяздольны рвецца — да цёплай хаткі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Яну Міхалюку** з Чыжоў і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Ганна КАНДРАЦЮК

Дзядоўскае турнэ з Анатолем С. (16)

Дняпро

У Гарошкаве найбольш не хапала ракі, якая пад уплывам прачытанага, здавалася, будзе цячы тут замест вуліцы. Той вобраз магутнай вады ўнушалі асабліва трывожныя радкі пра крыгаход напрадвесні. Запамяталася карціна. Навокал ноч. Анатоль разам з матуляй не спяць. Слухаюць як прабуджаецца Дняпро. Спалучэнне стыхіі з бяссонніцай прамаўляе трывогай. Адначасова ўсведамляем як спрацоўвае генетычная памяць у людзей, што нарадзіліся ля вялікай ракі. Яны адны здольныя разгадваць яе настрой, зазірнуць у цёмныя віры, прачытаць мімалётныя знакі. Невыпадкова вялікія паэты нараджаюцца ля вялікіх рэк!

— Як „гучыць” крыгаход? — спыталі мы ў Сяргея Сыса. — Чаму ён не дае сплюшчыць вока?..

— Ён не гучыць, а „страляе”, — паясніў сваяк і аднапляменец Анатоля.

— Як „страляе”?

— Нармальна, як артылерыя. Грукат ідзе ад крыгалому, калі пад змерзлай паверхняй раскоўваюцца ўнутраныя пласты лёду...

— Людзі баяцца крыгалому?

— Крыгалом успрымалі добра, бо гэты „стрэл” абазначаў, што вясна ўжо не за гарамі....

* * *

Мой Дняпро тры тысячы гадоў
Косці круціць у вірох барвовых,
Аж дасюль бруіцца з ранаў кроў
На ягоных змучаных рамёнах,
Мрояцца адвечнымі віры
Людзям зь берагоў і птушкам зь неба,
Быццам вавілонскія муры
Ў плашчаніцах воблачнага зрэб'я.
Нават ноч баіцца зазірнуць
У віры —
Здаецца, пад карчамі
Крывічы прыкутыя ляжаць
Да гармат расейскіх ланцугамі,
А на барву змрочнае ракі
Узыходзяць чарапы, як поўні,
І на іх, нібы на маякі,
Праз вякі
Брыдуць з палону коні.
Рэха капытоў майго каня
Працінае вір адчаем лютым,
Толькі не сустрэну яго я,
Ланцугамі да гармат прыкуты.
(А. С. — Мой Дняпро...)

* * *

У падобным змрочна-катастрафічным настроі паэт праявіў эратычны ўзлёт лірычнага героя. Асабістыя пачуцці пазначаныя вялікай тайнай, якую паэт даручае адной рацэ. Іх моц на момант фарбуе барвамі вясёлкі змрочныя віры, сыціць жыватворным кіслародам, ажыўляе міфы пра рай. Карціны шчасця ў Анатоля Сыса, як прынцып, абрываюцца нечакана і брутальна.

Эратызм у Анатоля Сыса, як не цікава, нераздзельны з песняй, вадой і агнём, быццам жыўцом спісаны з купальскіх абрадаў. Гэты магічна-архаічны абрад у гонар сонца спраўляюць у Гарошкаве па сённяшні дзень, дакладней ва ўрочышчы, вядомым як Цішкаў пляж.

— Дзяўчаты бяруць з сабой багата яды, хлопцы, канешне, выпіўку і гуляюць да белага рання, — апавядае равеснік паэта, удзельнік гульбішча трыццацідвухгадовай даўнасці...

— А як тады гулялі?

— Нармальна: спявалі, купаліся...

— І коні таксама купаліся разам з людзьмі?

— Коней мылі яшчэ да таго як распаляць агонь, пасля іх пускалі пасвіцца ля ракі.

— А якія песні спявалі? Памятаеш хоць адну?

— Не памятаю ўжо... Адно што запомнілася, гэта жарты, якія прыдумвалі хлопцы. Яны падмаўлялі дзяўчат скідаць адзенне і скакаць ля агню. Бо гэта мела ачысціць іх ад прышчоў, высыпкі і ўсякай каросты. Пасля моладзь дабіралася ў парачкі і разыходзілася па лугах шукаць „папараць-кветку”...

Сярод адмаляванай карціны мы „пабачылі” таксама Анатоля Сыса з дзяўчынай з Гарошкава.

— Анатоль усё жыццё кахаў яе АДНУ, — сказаў нам наш субяседнік. — Ён пакахаў яе яшчэ ў школьныя гады. Яны доўга сустракаліся, разам гулялі, хадзілі... Пасля штось дрэннае сталася. Т. уцякла ад Анатоля ў вялікі горад, там выйшла замуж, нарадзіла дзяцей. Анатоль ніколі не змірыўся з яе адыходам. Некалькі разоў званіў ёй, канешне, калі быў выпіўшы, бо па-цвярозаму гэтага не ўмеў зрабіць...

— А чаму пра гэтае пачуццё ніхто не піша, не гаворыць? — пацікавіліся мы. — Гэта ж гонар быць музай геніяльнага паэта!

— Лёгка вам гаварыць, — папракнуў нас субяседнік, які папрасіў не называць яго імя. — А вы падумалі, як такую навіну ўспрыме ЯНА?! У яе ж дзеці, мужык. Ды і мужык з-за такога ашалець можа, з кулакамі накінуцца...

Мы з Мірай таксама не ведалі як успрыняць апошнюю сенсацыю. Супраць ідэі АДЗІНАЙ жанчыны і тым самым супраць нас саміх маглі б насцярожыцца дзесяткі „ўдавіц”, якія выявілі сябе пасля смерці паэта.

* * *

Фізічная блізкасць ракі ў творчасці Анатоля Сыса — вобраз спісаны з рэальнага краявіду. Яшчэ адносна нядаўна, у час веснавога разводдзя або летніх паводак, Дняпро разліваўся на сем-дзесяць кіламетраў і падыходзіў аж пад хаты гарошкаўцаў.

Фота Міры ЛУКШЫ

Гутаркі пра Дняпро з Сяргеем Сысом мы працягнулі ў нашым Васількаве

— Выйдзе мужык на агарод, а там у раўку пасля бульбы шчупак як парася калоціцца, — успамінае Сяргей Сыс. У час вясновых паводак рака часта залівала ягоную Заспу. Апошні ўспамін яшчэ сёння сантыментам праплывае праз сэрца. Сёння рака здаецца спакойнай і адлеглай (з панадворка паэта на Цішкаў пляж кіламетры тры напрасткі, з могільніка з пяць кіламетраў). Шаснаццаць гадоў таму на прасторах даліны зрабілі праект: галандскія польдэры. Рака паразлівалася па штучных прыступках і ўжо не залівае даліны, якая калісь сама вызначала сваё натуральнае ложа. Для маладых, што нарадзіліся пасля згаданай праўкі ў прыродзе, Дняпро здаецца быць бяспечным і бязгучным, як мадэль сучаснага жыцця...

(*працяг будзе*)

21.03 — 27.03

(22.03. — 20.04.) Маладзік прынясе табе мешаныя пачуцці. З аднаго боку адчуеш ахвоту на змены, з другога палічыш, што яшчэ на гэта зарана. Набярэшся самаўпэўненасці і, не азіраючыся на іншых, рушыш уперад. Ранейшыя інвестыцыі могуць прынесці прыбытак.

(21.04. — 21.05.) Мілей табе будзе прабываць у хатнім зацішку, таксама можаш узяцца за меншы ці большы рамонт. Справамі ў пары ты пакіруеш лепш. На працы можаш выгарнуць усю праўду ў вочы тым, хто цябе патрактаваў несправядліва; зробіш гэта досыць, усё ж, дыпламатычна.

(22.05. — 22.06.) Да 22.03. пільнуйся тых, хто табе шмат абяцае. Больш часу на кампанейскія сустрэчы. Можаш сустрэцца з тымі, з кім у апошні час кантактуешся толькі па тэлефоне. Поспехі — твая спецыяльнасць. Калі будзеш рабіць тое, у чым не разбіраешся, хутка навучышся. Калі маеш на воку нейкі большы інтарэс, не бойся ў яго ўвайсці.

(23.06. — 23.07.) Праца будзе даваць табе прыбытак і прыемнасць. Грошы заробіш хутка, але ж і ўдала іх расходуеш. Трымайся тых людзей, якія стаяць за табою ад пачатку, калі ты яшчэ не быў сярод пераможцаў.

(24.07. — 23.08.) Развінешся, а тваё жыццё набярэ новага, агромнага тэмпу. Цяпер не думай аб новай працы. У пары — без змен. Можаш займець пяць хвілін у бізнесе, які прынясе дабрабыт тваёй сям'і. На першы дзень вясны не плануй ніякіх падарожжаў.

(24.08. — 23.09.) Калі не хопіць табе адвагі на важныя фінансавыя рашэнні, хопіць яе ў твайго партнёра. Але да 22.03. не ўкладвай нікуды сваіх грошай. Нічога на сабе не вымушай, не падганяй таго, што патрабуе цяжкай і адказнай працы ды роздуму.

(24.09. — 23.10.) 20-24.03. нічога не будзе табе хацецца. Дык хоць прытварайся, што чымсьці займаешся. У кампанейскім жыцці крыху змен, і не ўсім будзеш рады. Давярай свайму інстынкту і „носу” — ёсць яшчэ час, каб свае справы абярнуць у тваю карысць. Ды на пакупках моцна пільнуй кашалька!

(24.10. — 22.11.) Да 22.03. бяссонніца; спрабуй адпачываць больш канструктыўна. Час змагання і перамагання цяжкасцей. Не ўваходзь у канфлікты, нават калі рацыя на тваім баку. У пачуццях праблемы, турбуючыя цябе і твайго партнёра, могуць яшчэ ўзмоцніцца. Прафесійныя справы рушаць з месца, але на працы сапраўдная гонка пацукоў; рабі сваё. Змяні свой імідж з вясной.

(23.11. — 22.12.) Добры настрой. Цяжка з рашэннямі, пачакай, каб сітуацыя сама высветлілася. Лады з партнёрам. У жыцці многа гаму, але ва ўсім разбярэшся. Твой інтэлект працуе на ўсю катушку. З пачаткам вясны схочацца больш паварушыцца.

(23.12. — 20.01.) 21-25.03. усё ідзе ўперад і ўвысь як па шнурочку. Можаш дазволіць сабе на фантазію. Будзь спантанны! З новай энергіяй і энтузіязмам возьмешся за тое, што здавалася быць нецікавым. Нанова ацэніш сябе, свае веды і ўмеласці. Устабілізуецца сітуацыя ў хаце. Ды 20-24.03. паслабее твая вітальнасць; зайдзі на лекарскае абследаванне ў добрага спецыяліста.

(21.01. — 19.02.) Многа запалу, энергіі. Справы, якія аформіш, прынясуць дабро ў пазнейшы час. Дома спакой. Са знаёмымі можаш паспрачацца, ды каструктыўная крытыка прыдасца абодвум бакам. Калі будзеш адчуваць сябе слабей, дык гэта вынік перанатугі; пі зёлкі. Вясной будзе лепш!

(20.02. — 21.03.) Варта брацца за новыя праекты! Будзь напагатове: можаш пачаць нейкія пераломныя ініцыятывы! Калі забаліць табе галава, дык толькі ад лішку эмоцый і цудоўных ідэй! Ды не насі носа завысока! Рамантычная канцоўка месяца.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960